Пролетары усіх краёў, злучайцеся!

Зьвязда

№ 295 (3403) Чацьвер 26 сьнежня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд.: Менск, Дзержынскага, 33
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1774, [illegible]—817, [illegible]—731

ГОЛАС ЗАМЕЖНАЙ ПРАСЫ

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ, 28. Як паведамляе га эта „Акшам“, вядомы ангельскі шпіен Лаўрэнс у апошні час знаходзіцца ў пагранічнай зоне Ірата, у раёне Масула. Лаўрэнс зараз разгортвае сваю дзейнасьць, накіраваную на шкоду інтарэсам Пэрсыі і Турцыі.

НАВІНЫ Б. С. С. Р.

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). У сувязі з тым, што прапоўнае насельніцтва гораду не здавальняецца малаком у належнай колькасьці, прэзыдыум райвыканкому пастанавіў арганізаваць пры Стара-Барысаўскім с. г. тэхнікуме малочную ферму а 200 кароў. На гэту мэту ўжо адпушчана 30.000 руб. Ферма ў першую чаргу будзе здавальняць малаком больніцу, дзіцячыя дамы і рабочых прадпрыемстваў.

Прамысловасьць БССР ня выканала пляновых заданьняў

ДАБІЦЦА РАШУЧАГА ПЕРАЛОМУ

Наша народная гаспадарка ў гэтым годзе павінна зрабіць далейшы вялікі крок уперад па шляху сацыялістычнай рэканструкцыі. Індустрыялізацыя краіны, перавод сельскае гаспадаркі на калектыўныя рэйкі, выкананьне пяцігодкі за 4 гады, — усё гэта патрабуе ад нашай **прамысловасьці** ўзмацненьня тэмпаў работы, значнага росту прадукцыі, абавязковага выкананьня ўсіх пляпаў па зьніжэньні сабекошту, павялічэньні прадукцыйнасьці працы, паляпшэньні якасьці прадукцыі.

Вынікі першага году пяцігодкі, падём творчай энэргіі рабочае клясы, сацыялістычнае спаборніцтва, ударніцтва, — усё гэта дае падставы сьцьвярджаць, што намечаныя кантрольнымі лічбамі тэмпы ня толькі рэальны, але і могуць быць **перавышаны.** Правільным скарыстаньнем усіх рэсурсаў, што ёсьць у нашым распараджэньні, накіраваньнем па належным рэчышчы актыўнасьці рабочых мы маем поўную магчымасьць з посьпехам перамагчы ўсе труднасьці, якія сустракаюцца на шляху гаспадарчага будаўніцтва.

Між тым, вынікі работы **прамысловасьці** БССР у першыя месяцы новага гаспадарчага году гавораць аб адставаньні ад тэмпаў, намечаных кантрольнымі лічбамі на 1929-30 год.

Амаль усе асноўныя галіны беларускай прамысловасьці ня выканалі лістападаўскага пляну па выпуску прадукцыі.

Так, напрыклад, шкляная прамысловасьць ня выканала лістападаўскай вытворчай праграмы на 5,7%, а за першыя два месяцы вытворчага году — кастрычнік і лістапад — на 4%. Мэталёвая прамысловасьць дала ў лістападзе 75% праграмы, гарбарная — 83,7%, папяровая — 90,4%, харчовая — 99.5%.

Некаторыя галіны беларускай прамысловасьці ў лістападзе паменшылі разьмеры сваёй вытворчасьці ў параўнаньні з кастрычнікам. Шкляная прамысловасьць дала зьніжэньне на 2½ проц., ільна-прадзільная — на 5,7%, папяровая — на 10%, запалкавая — на 10,6%.

Выпрацоўка будаўнічых матар'ялаў паменшылася на 9,1%. Паніжэньне разьмераў вытворчасьці некаторыя гаспадарнікі тлумачаць трыма сьвяточнымі днямі ў лістападзе. Гэта тлумачэньне, аднак, ня можа нас задаволіць, бо і з выкананьнем якасных паказальнікаў у нас абстаіць нядобра.

На жаль, мы ня можам прывесьці даных аб дынаміцы сабекошту. Як паведамляла пядаўна «Зьвязда», спецыяльная нарада, якая адбылася пры ВСНГ, канстатавала, што гаспадарнікі ня ведаюць стану сабекошту на іх прадпрыемствах. Асобныя ўжо факты гавораць аб магчымасьцях зрываў на такім важнейшым вучастку гаспадарчай работы. Так, напрыклад, папяровая прамысловасьць у кастрычніку зьнізіла сабекошт на 7,54% супроць 12,2% паводле пляну.

На многіх прадпрыемствах наглядаецца небясьпечная тэндэнцыя пагоршаньня якасьці прадукцыі. Рост браку меў месца на галянтарэйнай і на радзе запалкавых фабрык.

Значна лепш з прадукцыйнасьцю працы. У лістападзе яна вырасла ў параўнаньні з кастрычнікам на 7,9%, а ў параўнаньні з папярэднім годам — на 26,9%.

Нездавальняючыя вынікі работы беларускай прамысловасьці ў лістападзе прымушаюць нас біць трывогу. Трэба прызнаць барацьбу за ўзмацненьне тэмпаў далёка невыстарчальнай. Усе рэсурсы, якія ёсьць у нашым распараджэньні, не скарыстаны. І ў першую чаргу такая моцная прылада рабочае клясы, як сацыялістычнае спаборніцтва. Кіраўніцтва прафсаюзаў і гаспадарнікаў сацспаборніцтвам усё яшчэ моцна адстае ад пад'ёму творчай актыўнасьці мас. На прадпрыемствах няма ўліку вынікаў спаборніцтва. Мала зварачаецца ўвагі на прапановы рабочых, правядзеньне ў жыцьцё якіх можа шмат даць для рацыяналізацыі вытворчасьці.

Прыкладам таго, што можа даць належнае скарыстаньне актыўнасьці рабочай масы, можа служыць швэйная прамысловасьць, якая дала прырост прадукцыі ў лістападзе ў параўнаньні з кастрычнікам на 1,9%, ня гледзячы на скарачэньне колькасьці рабочых дзён. Гэтыя станоўчыя вынікі здабыты, дзякуючы сацыялістычнаму спаборніцтву і рацыяналізацыі фабрык.

Трэба дабіцца безадкладнага і рашучага пералому ў рабоце нашай прамысловасьці. Лістапад сьгналізуе. Нельга паўтараць памылак мінулага году, калі ў адносінах якасных паказальнікаў спачатку разьлічвалі на самацёк, а потым, у другім паўгодзьдзі, прышлося ўжыць тэрміновыя меры, каб нагнаць прапушчанае.

Гаспадарчым і прафсаюзным арганізацыям трэба дабіцца значна больш хуткіх тэмпаў у сваёй рабоце, тэмпаў, якія не адстаюць ад росту актыўнасьці мас, якія дадуць магчымасьць ня толькі выканаць, але і перавысіць кантрольныя лічбы прамфінпляну.

Работа прамысловасьці ў лістападзе

Кан'юнктурным бюро ВСНГ падагулены вынікі работы прамысловасьці БССР у лістападзе м-цы. Валавая прадукцыя прамысловасьці БССР у параўнаньні з мінулым месяцам зьнізілася на 3%. Лістападаўскі плян выпуску валавой прадукцыі такім чынам ня выкананы.

Прамысловасьць, якая пераведзена на бесьперапынку, у лістападзе ўжо складала калі 17%. На бесьперапынку пераведзена 21 прадпрыемства, у якіх працуе 7.632 рабочых.

Асабліва трэба спыніцца на прамысловасьці, якая вырабляе будаўнічыя матар'ялы. Гэта галіна прамысловасьці дала зьніжэньне ў параўнаньні з мінулым месяцам на 9,1%. Скарачэньне вытворчасьці ідзе, галоўным чынам, за кошт выпрацоўкі цэглы, якая паменшылася ў лістападзе на 14,9%.

Астатнія галіны прамысловасьці, за выключэньнем швэйнай і харчовай, як мы ўжо адзначылі, далі зьніжэньне валавой прадукцыі ў параўнаньні з мінулым месяцам. Адмоўна на работу прамысловасьці ўплывала напружанае становішча з забесьпячэньнем сырцом, невыстарчальнае скарыстаньне абсталяваньня і памяншэньне колькасьці рабочых дзён у лістападзе.

Колькасьць рабочых на прадпрыемствах у лістападзе павялічылася на 2,2%. Лістапад дае таксама павялічэньне прадукцыйнасьці працы кожнага рабочага ў параўнаньні з мінулым месяцам на 7,9%, а ў параўнаньні з мінулым годам на 26,9%.

Характэрна таксама адзначыць рост у лістападзе сацыялістычнага спаборніцтва, што адбілася ў росьце ўдарных брыгад. Калі на 1-га кастрычніка налічвалася 82 брыгады з 1.044 ударнікамі, дык на 1-га сьнежня гэта колькасьць узрасла да 270 брыгад з 3.251 рабочы. Рад цэхаў і заводаў запалкавай, швэйнай і дрэваапрацоўчай прамысловасьці абвясьцілі сябе ўдарнымі.

Належыць таксама спыніцца на пагоршаньні якасьці прадукцыі ў некаторых галінах прамысловасьці. Так, павялічыўся брак на запалкавых фабрыках, а таксама і на галянтарэйнай фабрыцы.

Колькасьць прагулаў у лістападзе скарацілася да 0,46 супроць 0,54 у кастрычніку. Побач з гэтым павялічыўся ад старых рабочых заводу «Чырвоны Араты». На сходзе гарнякоў цэнтральнае Семяроўскае капальні калектыўна ўступілі ў партыю 40 гарнякоў. Рабочыя рудаперакатнага цэху паравозабудаўнічага заводу абвясьцілі свой цэх ударным, даўшы яму імя т. Сталіна. Тав. Сталіну паслана прывітальная тэлеграма, у якой рудаперакатчыкі заяўляюць, што цьвёрда пойдуць па адзначаным партыяй шляху і пад жалезным кіраўніцтвам т. Сталіна выканаюць пяцігодку ў 4 гады.

Рост нявыхадаў на работу па хваробе можна ў некаторай ступені тлумачыць за лік утойваньня прагулаў.

Трэба адзначыць поўную адсутнасьць матар'ялаў аб сабекошце. Прадпрыемствы яшчэ не прыстасаваліся да пераходу на штомесячную калькуляцыю. Весткі аб сабекошце ёсьць толькі па папяровай прамысловасьці. Паводле гэтых вестак у кастрычніку сабекошт зьнізіўся на 7,54% супроць 12,2%, вызначаных па пляну.

Клясавая барацьба ў краінах капіталу

Забастоўка 25 тысяч рабочых у Мілане

Кавалерыя і фашысцкая міліцыя супроць бастуючых

ВЭРЛІН, 24. З Італіі атрыманы весткі, што ў Мілане пачаўся забастовачны рух, які суправаджаецца крывавымі сутычкамі паміж бастуючымі рабочымі і вайсковымі часьцямі. Забастоўкі адбываюцца на некалькіх буйнейшых прадпрыемствах Мілана.

Міланскія прадпрыемцы ў апошні час вялі наступленьне на жыцьцёвы ўзровень рабочых, сыстэматычна зьніжаючы заработную плату. Нелегальная камуністычная партыя Італіі, якая вядзе барацьбу супроць капіталістычнага наступленьня і аб'яднаньні прафсаюзаў, каторыя знаходзяцца пад рэвалюцыйным кіраўніцтвам, заклікалі рабочую клясу да барацьбы за павышэньне заработнай платы. Прадпрыемцы адказалі на гэтае патрабаваньне пагрозай лёкаўту на буйных прадпрыемствах, заяўляючы, што яны пакінуць толькі тых рабочых, якія жадаюць працаваць па старых умовах.

Выклік прадпрыемцаў быў прыняты рабочымі, — яны абвясьцілі забастоўку. У забастоўцы прымаюць удзел 25 тысяч рабочых. Супроць бастуючых выступілі кавалерыйскія атрады і міліцыя. Вайсковыя часьці, якія напалі на бастуючых, праявілі страшэнную жорсткасьць і грубасьць. У часе сутычкі паранена шмат рабочых. Даных аб ліку забітых яшчэ няма. Работніцы і жонкі рабочых увесь час выступалі ў першых радах бастуючых.

КАТАРЖНЫ ПРЫСУД У ЛІТВЕ

КОЎНА, 24. Суд прыгаварыў да 9-ці год катаржных работ 2-х студэнтаў, якіх абвінавачвалі ў пашырэньні камуністычных адозваў у часе практыкаваньня ў чыгуначных майстэрнях.

Аднаўленьне сьледзтва па справе 154 у Парыжы

ПАРЫЖ, 24. Пасьля некалькіх тыдняў перарыву адноўлена сьледзтва па справе 154-х членаў камуністычнай партыі і ўнітарнай канфэдэрацыі працы, якія абвінавачваюцца ў «змове супроць замежнай і ўнутранай небясьпекі дзяржавы». Урэчы судовы сьледчы ў часе допыту сакратара ўнітарнай канфэдэрацыі працы Манмусо, зноў абвінавачвае кампартыю ў намеры «ў страшны дзень»—першага жніўня заваяваць вуліцу і выклікаць паўстаньне з мэтай скінуць урад і ўстанавіць дыктатуру пралетарыяту.

У сваім адказе Манмусо паўтарыў, што задачай дня першага жніўня была мабілізацыя міжнароднага пралетарыяту супроць імпэрыялістычнай вайны шляхам масавых выступленьняў на заводах і вуліцах.

Паход супроць рабочага руху у Фінляндыі

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ Ў ГЭЛЬСІНГФОРСЕ і ВЫБАРГУ

ГЭЛЬСІНГФОРС, 24. Газэта «Паведамленьні рабочых арганізацый» паведамляе аб радзе арыштаў сярод дзеячоў левага рабочага руху ў Гэльсінгфорсе і Выбаргу. Сярод арыштаваных сакратар соймавае фракцыі левых сацыялістых.

Міністар замежных спраў у гутарцы з супрацоўнікам газэты прагрэсыстых заявіў, што новы закон аб таварыствах дае магчымасьць зьліквідаваць дзейнасьць фінляндзкага камсамолу, які на лічбе ў краі каля 200 аддзелаў, і наогул спыніць актыўнасьць камуністычных і грамадзкіх арганізацый.

Як ужо паведамлялася, рэакцыйны закон аб таварыствах, які дае права ўраду разганяць грамадзкія арганізацыі і які накіраваны па сутнасьці супроць кампартыі, прыняты з прычыны здрадніцтва сацыял-дэмакратаў.

ГЭЛЬСІНГФОРС, 23. Фінляндзкае тэлеграфнае агенцтва падае, што ўчора арыштаваны сакратар камуністычнай фракцыі сойму (парляманту) яго жонка, сакратар фінляндзкага камсамолу, а таксама некалькі другіх камуністых.

Новая хваля рэпрэсій супроць нямецкай кампартыі

ВЭРЛІН, 20. Новая хваля ўрадавых рэпрэсій вырвала з радоў актыўных барацьбітоў клясавага пралетарскага фронту многіх каштоўных работнікаў. Яны кінуты ў турмы і крэпасьці па загаду буржуазіі і сацыял-фашысцкіх паліцмэйстэраў.

Рэдактар камуністычнай газэты ў Турынгіі «Нэйе Цэйтунг» прыгавораны да двух год крэпасьці за апублікаваную адозву ЦК КПН, чакаецца прыгавор над супрацоўнікамі гэтай-жа рэдакцыі т. т. Грунік, Герхард і Блюм.

У Гале т. Фрыц Людвіг прыгавораны да году крэпасьці за «шкодную работу» сярод паліцэйскіх. У Галі прыгавораны да году крэпасьці і 100 марак штрафу адказны рэдактар мясцовай камуністычнай газэты «Арбэйтэр Цэйтунг» (рабочая газэта) т. Дамброўскі.

У Мюнхэне суд прыгаварыў да 7 месяцаў турмы камдэпутата ляндтагу тав. Дрэсэля. Ён абвінавачваўся ў кіраўніцтве дэманстрацыяй беспрацоўных. Арыштаваныя разам з ім двое рабочых прыгавораны да 6 месяцаў турмы. Адказны рэдактар камуністычнай газэты «Рур Эхо» за зьмяшчэньне 15 артыкулаў, якія заклікалі «да падрыхтоўкі дзяржаўнай здрады» прыцягваецца да суду.

Рэдактары магдэбургскай камуністычнай газэты «Трыбуна» т. т. Вілі Эйльдэрман і Рудольф Брант за зьмяшчэньне раду артыкулаў, прыцягваюцца да судовай адказнасьці па абвінавачаньні ў дзяржаўнай здрадзе.

У Дусэльдорфе ўзбуджана справа супроць 12 рабочых, якія прымалі ўдзел у дэманстрацыі, разагнанай паліцыяй.

У Крэфэльдзе пачынаецца працэс 170 маладых рабочых, якія прымалі ўдзел у камсамольскім сходзе. У Галі прыцягваюцца да суду рад левых членаў прафсаюзу. У некалькіх гарадох Рурскай вобласьці арыштаваны рад рабочых за выкрыкі «Рот Фронт» (прывітаньне забароненага саюзу чырвоных франтавікоў). У Гановэры зроблены масавыя вобыскі ў членаў кампартыі і ў памяшканьні камітэту партыі.

Камуністычная прэса заклікае рабочых адказаць на гэту хвалю рэпрэсій узмацненьнем барацьбы супроць урадавага тэрору і ўступленьнем у рады кампартыі. (ТАСС).

Масавыя арышты камуністых па ўсёй Мэксыцы

НЬЮ-ЁРК, 22. Як паведамляюць з Мэксыкі, паліцыя і вайсковыя ўлады правялі масавыя арышты сярод камуністых па ўсёй Мэксыцы. Конная паліцыя пры падтрыманьні вайсковых часьцей, зрабіла налёт на сход камсамольцаў і арыштавала 12 удзельнікаў сходу; адначасова паліцыя зрабіла вобыскі ў памяшканьнях усіх рабочых партыйных арганізацый і ў кватэрах шматлікіх членаў Мэксыканскае кампартыі. У часе вобыскаў было арыштавана каля 30 чал. Падобныя-ж вобыскі і арышты адбываліся і ў іншых гарадох Мэксыкі.

Масавыя арышты выкліканы тым посьпехам, які мелі ў апошні час лістоўкі і адозвы Мэксыканскае кампартыі. У бліжэйшым чакаюцца новыя вобыскі і новыя арышты.

Рэакцыйны орган «Эксцэльсіёр» прабуе намаляваць мсавыя арышты камуністых, як «вылоўліваньне банды міжнародных тэрарыстых». З гэтае тактыкі відаць, што мэксыканскія ўлады ня маюць намеру публічна прызнаць, што арыштаваны іменна камуністыя, бо баяцца, што гэтае паведамленьне выкліча хвалю моцнага абурэньня з боку рабочых і сялянскіх мас.

Лідэр рэвалюцыйных прафсаюзаў Сэкіёрас зьвярнуўся да Мэксыканскага ўраду і прэсы з пратэстам супроць масавых арыштаў камуністых. Сэкіёрас заявачае, што арыштаваныя знаходзяцца ў ваенных лягерах і пазбаўлены харчаваньня. Усе асобы, якія прыносяць у лягеры перадачу, у прыватнасьці, харчовыя прадукты, неадкладна арыштоўваюцца ўладамі. Сэкіёрас падкрэсьлівае, што многія чужаземцы арыштаваны толькі таму, што яны зьяўляюцца членамі рэвалюцыйных прафсаюзаў, ня гледзячы на тое, што яны наогул не займаюцца палітычнаю дзейнасьцю. Сэкіёрас пратэстуе супроць таго, што арыштаваныя знаходзяцца ў залежнасьці ад вайсковае улады і не перададзены грамадзянскай адміністрацыі.

Вялізарная антырэлігійная дэманстрацыя беспрацоўных ў Бэрліне

ВЭРЛІН, 25. Напярэдадні каляд у цэнтры буржуазнага кварталу Бэрліна, на Вітэнбэрг-Пляц адбылася вялізарная дэманстрацыя беспрацоўных, якія сабраліся для таго, каб дэманстраваць супроць буржуазнае хлусьні каляднага сьвята і паказаць, як сустракаюць беспрацоўныя калядны. На чале дэманстрацыі ішлі рэвалюцыйныя правадыры, якія трымалі ў руках плякаты з надпісамі: «Хлеба і работы», «Мы хочам знаць, чаму багатыя сьвяткуюць, а мы павінны галадаць».

На сярэдзіне пляцу была пастаўлена елка, убраная карткамі беспрацоўных. Дэманстранты пялі народныя на каляднымі хорал, але адначасова не пераставалі крычаць: «Голад, голад».

Пасьля мітынгу дэманстрацыя беспрацоўных накіравалася з Вітэнбэрг-Пляцу ў рабочыя кварталы гораду. Шматлікія атрады паліцыі загарадзілі дарогу дэманстрантам і стараліся не прапушчаць іх праз цэнтральную часьць буржуазнага кварталу.

Гэты паход рэзка адрозьніваўся ад сьвяточнага настрою буржуазіі.

ПЕРАМОГА МЭТАЛІСТЫХ У ГІЗЕ

ПАРЫЖ, 24. Забастоўка мэталістых у Гізе скончылася. Пасьля 26-цідзённай барацьбы мэталістыя Гізу дабіліся перамогі. Павышаецца заработная плата на 2,4 франкі (франк раўняецца 7 з паловай кап.) у дзень і ўстанаўліваецца 5-процантнае павышэньне асноўнай заработнай платы. Мясцовыя арганізацыі камуністычнай партыі і ўнітарнага прафсаюзу мэталістых выходзяць з забастоўкі значна ўзмоцненымі.

1.560 ТЫСЯЧ ФРАНКАЎ У ФОНД «ЮМАНІТЭ»

ПАРЫЖ, 24. Дабраахвотныя ўзносы рабочых у карысьць органу кампартыі «Юманітэ» дасягнулі сумы ў 1.560.000 франкаў.

3-га СТУДЗЕНЯ АДКРЫВАЕЦЦА 2-я ГААГСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ

ВЭРЛІН, 24. Адкрыцьцё другое гаагскае канфэрэнцыі канчаткова прызначана на 3-га студзеня

ЭКАНАМІЧНЫ КРЫЗІС У АМЭРЫЦЫ

За два месяцы звольнена 421 тысяча рабочых

НЬЮ-ЁРК, 21. Эканамічны крызіс усё яшчэ пагыбляецца. Разьмеры вытворчасьці і гандлёвых дагавораў у сучасны момант значна ніжэйшыя, чым вясной і летам гэтага году і не дасягаюць зваротаў адпаведнага пэрыяду мінулага году. З статыстычных даных розных буржуазных дасьледчых інстытутаў відаць, што скарачэньне вытворчасьці за лістапад месяц зьяўляецца, бязумоўна, адным з большых ад часу сусьветнае вайны. Паводле «Джорналю Аналіт», камбінаваны індэкс на гандлёвым аварооце за лістапад месяц склаў 954, у кастрычніку—1.035, а ў лістападзе 1928 г. —1.015. Камэнтуючы гэтыя лічбы, «Джорналь» піша: «Зьніжэньне індэксу ідзе такім шпаркім тэмпам, што ён сьведчыць аб магчымасьці будучае дэпрэсіі. Гэтая дэпрэсія, відавочна, будзе менш пагубнай, чым у 1921 годзе, аднак, напэўна, большая, чым дэпрэсыя ў 1924 годзе.

Статыстычныя даныя, апублікаваныя арганізацыяй, сьцьвярджаюць, што за лістапад месяц прадукцыя аўтамабільнае прамысловасьці скарацілася на 15 проц. у параўнаньні з лістападам мінулага году. Адзначана скарачэньне прадукцыі ў сталяліцейнай, медзяной, лясной, бавоўняна-папяровай і швэйнай прамысловасьці.

Паводле паведамленьня «Аналіт» **за верасень і кастрычнік месяцы з амэрыканскіх прадпрыемстваў звольнена 421 тыс. рабочых.**

Пэрсыя адхіліла прапанову Амэрыкі

ТЭГЭРАН, 24. Пэрсыдзкі друк публікуе паведамленьне, што на прапанову Амэрыкі далучыцца да выступленьня дзяржаў па пытаньні аб канфлікце на К.-У. чыг. пэрсыдзкі ўрад адмовіўся. У паведамленьні гаворыцца: «У пэрсыдзкага ўраду няма падстаў думаць, што Савецкі Саюз міркуе распачаць варожыя дзеяньні ў адносінах да Кітая. Акрамя таго, урад улічвае непасрэдныя перагаворы, якія пачаліся паміж Савецкім Саюзам і Кітаем. З прычыны гэтага пэрсыдзкі ўрад ня лічыць для сябе магчымым выступіць з прадстаўленьнем».

Перагаворы Бартэля з міністрамі папярэдняга габінэту

ВАРШАВА, 23. Прафэсар Бартэль, якому прэзыдэнт даручыў скласьці новы габінэт, прыехаў у Варшаву, дзе наведаў прэм'ера Сьвітальскага, а потым прыняў міністра замежных спраў Залескага, міністра фінансаў і міністра шляхаў зносін. Пасьля поўдня ён працягваў перагаворы з маршалам Пілсудскім. У гутарцы з журналістымі Бартэль выказаў сваё здавальненьне вынікамі сёньняшніх перагавораў.

Прафарганізацыі марудзяць з вярбоўкай рабочых у калгасы

Дырэктывы прэзыдыуму ЦСПСБ ня выконваюцца

Шырокія рабочыя масы з вялікім энтузіязмам сустрэлі пастанову ЦК КП(б)Б аб дапамозе вёсцы паскорыць і пашырыць справу калектывізацыі і вярбоўцы 500 рабочых для насылкі ў калгасы. Аб гэтым гавораць факты на асобных прадпрыемствах. Напрыклад, на Добрускай фабрыцы «Гэрой Працы» 300 рабочых падалі заявы аб жаданьні паехаць у калгасы па пастаянную работу. На Нова-Беліцкай фабрыцы «Вэзуві» фабком атрымаў заявы аб 50 рабочых, гомельскія чыгуначнікі таксама падалі звыш 50 заяў. Гэта сьведчыць аб гатоўнасьці рабочых мас даць патрэбную колькасьць добраахвотнікаў.

Але **агульны вынік** кажа аб тым, што далёка не на ўсіх прадпрыемствах праведзена належная растлумачальная работа аб важнасьці насылкі рабочых у калгасы. Усяго пакуль што прадпрыемствы далі толькі 231 добраахвотніка (адабраных ужо для насылкі). Вінаваты ў гэтым, галоўным чынам, профорганы, уключаючы цэнтральныя праўленьні саюзаў, якія ня здолелі мабілізаваць грамадзкую думку вакол гэтага пытаньня. Ёсьць факты, што некаторыя нізавыя праф'ячэйкі нават ня ставілі на абгаварэньне агульных сходаў пытаньне аб насылцы рабочых у калгасы. Таму, зразумела, што на гэтых прадпрыемствах рабочыя нават ня ведаюць **аб магчымасьці** падаць заяву, каб паслалі ў калгас.

Гэта поўнасьцю пацьвярджае нязначная колькасьць добраахвотнікаў у пасобных округах. Паводле вестак ЦСПСБ, у Магілеве пакуль што запісаліся 34 чалавекі, у Воршы — 27, у Мазыры — 24, у Полацку — 28, у Менску — 29 і толькі ў Гомелі, дзе на прадпрыемствах праведзена некаторая масавая работа, запісаўся 471 чал., з якіх адабрана для насылкі ў калгасы 89. Такім чынам, Гомельская округа — адзіная, дзе справа з вярбоўкай рабочых для калгасаў абстаіць больш-менш добра.

Прэзыдыум ЦСПСБ, на пасяджэньні якога абмяркоўвалася гэтае пытаньне, даў прафсаюзам жорсткія дырэктывы, прычым прэзыдыум адзначыў **недапушчальныя адносіны большасьці ЦП саюзаў і акруговых праўбюро да разгортваньня масавай работы на прадпрыемствах па вярбоўцы добраахвотнікаў для калгасаў. Больш таго,** віцебскае акруговае бюро нават не паведаміла, як ідзе вярбоўка рабочых.

Прэзыдыум ЦСПСБ прапанаваў ЦП саюзам і акруговым праўбюро **пад асабістую адказнасьць іх старшынь** прыняць усе меры, каб вярбоўка добраахвотнікаў і адбор іх былі скончаны **да 1-га студзеня.** За посьвячаснасьцю інфармацыю ЦСПСБ аб ходзе вярбоўкі рабочых **Віцебскаму АПБ пастаўлена на від.**

Акрамя таго прэзыдыум ЦСПСБ прапанаваў аргаддзелу да 4-га студзеня канчаткова распрацаваць парадак аплаты рабочых, якія пасылаюцца на работу ў калгасы, а таксама падрыхтоўку рабочых праз спэцыяльныя курсы.

Засталося 5 дзён. Вярбоўка павінна закончыцца ў тэрмін.

Як будуць скарыстаны вылучэнцы ў калгасах

Як вядома, у беларускую калгасную сыстэму і калгасы будуць накіраваны 600 рабочых, у тым ліку 100 рабочых з прадпрыемстваў Ніжняга Ноўгараду, куды ўчора выехалі для правядзеньня вярбовачнай кампаніі адказныя працаўнікі ЦСПСБ і Белкалгассаюзу.

Як будзе разьмяркована гэта колькасьць рабочых — гэтае пытаньне ўчора вырашыла праўленьне Белкалгассаюзу сумесна з старшынямі акруговых калгассаюзаў. 5 рабочых будуць пакінуты ў цэнтры — у Белкалгассаюзе і калгасных сэкцыях каапэрацыйных саюзаў, 48 будуць накіраваны ў акруговыя цэнтры, 200 чалавек — у раёны ў якасьці старшынь і членаў праўленьняў раённых калгассаюзаў і паляводаў — і малочна-жывёлагадоўчых саюзаў, 102 — у праўленьні куставых калгасных аб'яднаньняў і 245 — старшынямі буйных калгасаў, сакратарамі парт'ячэек, кіраўнікамі вытворчых прадпрыемстваў, асобных галін сельскай гаспадаркі і культурна-бытавых устаноў.

НІЧОГА НЯ РОБІЦЦА

ПОЛАЦАК. (наш кар.). Вылучэньне рабочых у калгасы праводзіцца надзвычайна слаба. Вярбовачная кампанія амаль не пачыналася. Рабочым не растлумачана значэньне пасылкі. 5-га студзеня павінны адкрыцца курсы для падрыхтоўкі рабочых, але пакуль што кандыдатаў на гэтыя курсы няма. Мабілізацыя 28 рабочых у калгасы—пад пагрозай зрыву.

АПЛАТА РАБОТНІЦ, ЯКІЯ ПАСЫЛАЮЦЦА НА РАБОТУ Ў КАЛГАСЫ

СНК БССР пастанавіў захаваць на працягу аднаго - паўтара месяца заработную плату за работніцамі прадпрыемстваў і ўстаноў, якія пасылаюцца на часовую работу ў калгасы. Дзяржаўныя ўстановы камандыруюць жанчын-работніц у калгасы за свой кошт.

За рашучую перабудову прафсаюзнае работы

(З ПЕРАДАВОЙ «ПРАЎДЫ»)

Пасьпяховае ажыцьцяўленьне кантрольных лічбаў першага году пяцігодкі ў рашаючай ступені зьявілася вынікам вялізнай актыўнасьці і творчага энтузіязму рабочых мас. Гэтыя посьпехі першага году пяцігодкі былі-б бясспрэчна, яшчэ больш значныя, калі-б прафсаюзныя арганізацыі, ажыцьцяўляючы лёзунг партыі «тварм да вытворчасьці», больш шырока і поўна выкарыстоўвалі ўзьнятую пралетарскую актыўнасьць і, апіраючыся на перадавых рабочых, дапамагалі ім разьвіваць гэту актыўнасьць сярод самых шырокіх рабочых мас.

Задача пасьпяховага ажыцьцяўленьня намечаных кантрольных лічбаў другога году пяцігодкі патрабуе ў першую чаргу ўцягненьня самых шырокіх рабочых мас і спэцыялістых у сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарныя брыгады. УсеЦСПС у сваёй верасьнёўскай адозве мабілізуючы ўвагу прафсаюзаў і самых мас на задачах другога году пяцігодкі, рашуча патрабуе, «каб работнікі прафэсыянальных саюзаў, начынаючы з вышэйшых і канчаючы ніжэйшымі зьвенямі, перасталі займацца агульнымі фразамі аб актыўнасьці мас, а ўпчпльную падыйшлі да справы вытворчасьці, вывучалі ўсе канкрэтныя асаблівасьці сацыялістычнага спаборніцтва, арганізавалі кіраўніцтва заключэньнем дагавароў на сацспаборніцтва, редалі-б кожны дзень аб ходзе выкананьня гэтага дагавору, вызначалі-б шляхі выпраўленьня выкрытых недахопаў па выкананьні дагавароў, уцягваючы і зацікаўліваючы ўсім ходам і працэсам гэтай работы кожнага рабочага данага прадпрыемства».

Але яшчэ да гэтага часу многія прафсаюзныя работнікі, прызнаўшы правільнасьць генэральнай лініі партыі і выступаючы супроць правых, трэд-юніяністкіх элемэнтаў, яшчэ ня могуць скінуць з сябе старых тэмпаў і прывычак да работы.

Матар'ялы, якія друкуюцца сёньня ў «Правде», аб перабудове работы прафсаюзаў, сьгналізуюць нам аб адставаньні многіх прафсаюзных арганізацый. Ня гледзячы на тое, што тэкстыльная прамысловасьць у мінулым годзе недавыканала прамфінпляну, прафсаюзныя арганізацыі тэкстыльшчыкаў і ў другім годзе пяцігодкі ня ўлічылі яшчэ поўнасьцю гэтае сур'ёзнае акалічнасьці, ня перабудавалі сваю работу ў адпаведнасьці з пастановамі партыі і 9-га зьезду прафсаюзаў, кенска ўцягваюць масы ў спаборніцтва і гаспадарную работу. У выніку такой ненаваротлівасьці на трох Глухаўскіх фабрыках ва ўдарныя брыгады было ўцягнута толькі 36 чалавек.

Такія недапушчальныя адносіны да кіраўніцтва сацспаборніцтвам павінны быць рашуча зьнішчаны. Уся работа па вінна быць перабудавана нановаму. Усе саюзныя зьезды ударнікаў унёс рад практычных пастаноў, якія прафсаюзамі павінны быць хутка і рашуча рэалізаваны. Зьезд указаў, што прафсаюзы павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на вы хаваўчую работу з ударнікамі, дабіцца павышэньня іх тэхнічнага ўзроўню, замацаваць іх дасягненьні ў барацьбе за высокія тэмпы прадукцыйнасьці працы.

Акрамя таго, прафсаюзы разам з масамі павінны дапамагчы калгасам і саўгасам арганізаваць спаборніцтва ў вёсцы, перакінуць сюды перадавых пралетараў-ударнікаў. Вялікая задача стаіць перад прафсаюзамі і масамі па зьнішчэньні цэлага раду сур'ёзных недахопаў, якія затрудняюць выкананьне гаспадарчых плянаў, зьніжэньне сабекошту на 11 проц.

Работа клюбаў і чырвоных кутоў і пізнае прэсы павінна быць разгорнута ва ўсю шырыню і ў асноўным будавацца вакол асноўных гаспадарчых задач прадпрыемства. Пераняцьцё вопыту спаборніцтва і перабудовы работы ў лепшых прадпрыемствах на больш адсталых вучастках, павінна стаць таксама бліжэйшай справай прафсаюзных ар-

Па Савецкім Саюзе

Агітацыйная паездка па СССР экіпажу „Краіны Саветаў“

МАСКВА, 24. Прэзыдыум Асоавіяхіму СССР пастанавіў арганізаваць агітацыйную паездку па СССР экіпажу «Краіны Саветаў». Лётнікі наведаюць Ленінград, Харкаў, Менск, Донбас, Кіеў, Растоў на Доне, саўгас «Гігант», Днепрапятроўск, Днепрабуд, Баку, Сталінград, Грозны, раёны суцэльнае калектывізацыі, заводы Уралу і Іванава-Вазьнясенск.

ПАБУДОВА НОВАЕ ЧЫГУНКІ

АШХАВАД. Пачалася пабудова Чарджуй-Хівінскае чыгункі, якая злучыць з цэнтрам надзвычай багаты Харэзмскі аазіс, што дасьць магчымасьць значна павялічыць плошчу пасеваў бавоўны. Агульны працяг дарогі 1.908 кілёмэтраў. Будаўніцтва дарогі будзе каштаваць звыш 63 млн. руб. (ТАСС).

Новы правапіс расійскай мовы

МАСКВА. На нарадзе пры Галоўнаўваўцы прадстаўнік артаграфічнае падкамісіі паведаміў аб ходзе яе работы. Работа па спрашчэньні артаграфіі вялася ў бок набліжэньня пісьма да жывое мовы. Падкамісія выпрацавала 18 пунктаў, з якіх нарада зацьвердзіла наступныя: ня пісаць мяккага знаку пасьля шыпячых, напрыклад, **доч** «мыш». Пакінуць у якасьці знаку для аддзяленьня гукаў у слове толькі мяккі знак, напрыклад, **сьезд.** Скарочаныя словы пісаць без аддзяляльнага знаку, напрыклад, **нарнамюст.** Пасьля «ж, ч, щ, ц» пад націскам гук «о» пісаць праз літару «о» напрыклад, **чорный.** Пасьля «ж, ш, ц» пісаць «ы», напрыклад, **«соцыализм».** Ня пісаць падвоеных зычных ў чужаземных словах. Імёны назоўныя з канчаткам ў назоўным склоне «ь, е» павінны мець ў месным склоне канчатак **«ье»** замест **«ьи»,** напрыклад, **«Новольжье».** Прыслоўе, якое складаецца з прыйма і іншае часьці мовы пісаць злучана,

ЗЬВЯЗДА

Партыйнае будаўніцтва

Праверку пралетарскіх кадраў

скарыстаць для ўзмацненьня вярбоўкі

ПЕРАДАВЫХ РАБОЧЫХ І РАБОТНІЦ У ПАРТЫЮ ЛЕНІНА

Зьлёт „лёгкай кавалерыі" Кастрычніцкага раёну

Пазаўчора закончыў сваю работу спробны зьлёт «лёгкай кавалерыі» Кастрычніцкага раёну. Сабраць практыку работы, падагуліць дасягненьні, што маюць асобныя атрады, яшчэ больш уцягнуць «лёгкую кавалерыю» ў актыўную барацьбу з недахопамі ў камсамоле, на вытворчасьці, ва ўстановах, вызначыць далейшыя шляхі работы і т. д.— вось частка тых задач, якія стаялі перад спробным зьлётам «лёгкай кавалерыі» Кастрычніцкага раёну.

На зьлёце прысутнічала 300 дэлегатаў і 150 гасьцей—гаспадарнікаў, адміністратараў, рабочых.

Тав. Славінскі, які выступаў на зьлёце з прывітальнай прамовай ад імя АК КП(б)Б, асабліва падкрэсьліў той момант, што атрады «лёгкай кавалерыі» павінны быць авангардам на вытворчасьці, ва ўстановах, у ВНУ і тэхнікумах. Готы вялікі рэвалюцыйны абавязак вымагае ад «лёгкай кавалерыі» перабудовы ўсіх мэтаў і зьместу сваёй работы. Патрэбна падпачаліць новыя формы работы палітычным задачам, задачам барацьбы за правядзеньне генеральнай лініі партыі. Адсюль у першую чаргу вынікае патрэба тэрмінова прыступіць да ажыцьцяўленьня лёзунгу «тварам да вытворчасьці».

З вялікім дакладам аб пастановах XVI-й партканфэрэнцыі на чытаньні аб барацьбе з бюракратызмам, аб задачах ЛКСМБ і ролі «лёгкай кавалерыі» выступіў старшыня АКК тав. Дамброўскі. У мінулым годзе ў рабоце РСІ па Менскай акрузе прымала ўдзел 100 «лёгкіх кавалерыстых», а цяпер ужо—500.

Тав. Дамброўскі адзначыў, што работа «лёгкай кавалерыі» павінна стаць масавай, павінна прыцягнуць да ўдзелу ў сваёй штодзённай рабоце ўсю рабочую моладзь і шырокія колы працоўных. Зьлёт заслухаў даклад т. Юркянца аб чарговых задачах райарганізацыі ЛКСМБ, ролі «лёгкай кавалерыі» і мэтадах яе работы. Па ўсіх дакладах былі разгорнуты вялікія спрэчкі.

Зьлёт выбраў дэлегатаў на ўсебеларускі зьлёт «лёгкай кавалерыі», выбраў раённы штаб «лёгкай кавалерыі» і паслаў прывітальную тэлеграму т. Сталіну.

Прамтавары для Беларусі

Саюзным Наркамгандлем вылучаны для забесьпячэньня сельскага сэктару Беларусі спэцыяльны фонд скураных тавараў на 75.000 руб. Акрамя гэтага, адпушчана для забесьпячэньня ільнаводных раёнаў 10 вагонаў папяровавуняных тавараў.

Усесаюзны шахматны турнір асьвятлёнкаў у Менску

Сёньня ў Менску пачынаецца ўсесаюзны турнір шахматыстых — працаўніцкі асьветы. Турнір праводзіцца ЦК саюзу працасьветы.

Адбываецца ён будзе ў Доме Асьветы. Некалькі партый будуць разыгрывацца на буйнейшых менскіх прадпрыемствах.

Для ўдзелу ў турніры запрошана 18 чал., сярод іх—6 беларускіх шахматыстых: т. т. Пукевіч-Трацьцякоў, І. і Ю. Маззлі (Менск), Станэўскі (Магілеў). Тышлер (Віцебск) і Шалааў (Полацак).

У турніры прымуць удзел вядомыя майстры шахматнай гульні Ільін-Жэнэўскі і Макагонаў.

Ільін-Жэнэўскі ў міжнародным шахматным турніры ў Маскве ў 1925 годзе атрымаў прызы і выгуляў некалькі партый у сусьветных шахматыстых—Капабланкі, Рубінштэйна і Шпільмана.

Да ўвагі ўсіх шэф., парт. і праф. арганізацый.

У першых чыслах студзеня выходзіць спэцыяльны нумар часопісі

„ЛИЦОМ К ДЕРЕВНЕ",

прысьвечаны пасьлядку 25 тысяч рабочых у калгасы.

У нумары будуць зьмешчаны наступныя артыкулы:

1. Задачы рабочых, што адыжджаюць у калгасы.
2. Як арганізаваць калгасы.
3. Аб экспартных фондах у калгасах (сьвіваводзтва, птушкаводзтва і г. д.).
4. Як арганізаваць працу ў калгасах.
5. Перавыбары і чыстка калгасаў.
6. Аб рабоце груп беднаты ў калгасах.
7. Уцягненьне беднаты і батрацтва ў калгасы.
8. Шэфства над раёнамі суцэльнай калектывізацыі.
9. Новы статут калгасаў.
10. Шэфства над машынна-трактарнымі станцыямі і над іншых артыкулаў.
11. Задачы веснавой пасеўнай кампаніі.

Акрамя гэтага ў нумары будзе зьмешчана рад нарысаў, фальетонаў, апавяданьняў і лісты рабочых, што адыжджаюць у калгасы і г. д.

Нумар багата ілюструецца. Будзе зьмешчана больш 70 фота-здымкаў і малюнкаў.

Улічваючы, наогул, кіруючае значэньне часопісі «ЛИЦОМ К ДЕРЕВНЕ», шэфтаварыствам неабходна зьвярнуць вялікую ўвагу на распаўсюджваньне часопісі і кожны рабочы і служачы павінен стаць сталым яго падпісчыкам.

Падпісная плата часопісі: 1 мес.—30 кап., 3 мес.—80 кап., 6 мес.—1 руб. 60 кап., 1 год—3 руб.

ЦАНА СПЭЦЫЯЛЬНАГА НУМАРУ 15 кап.

Падпіска прымаецца Беларускім Аддзяленьнем «Правды»,—Менск, Савецкая, 61, і ўпаўнаважанымі шэфтаварыстваў па часопісі «ЛИЦОМ К ДЕРЕВНЕ».

Без. Адз. Выдавецтва ЦК УсеКП(б) «ПРАВДА».

Мабілізаваць увагу партарганізацыі вакол чысткі вытворчых ячэек

Камуністычная партыя мае на вытворчасьці найбольш устойлівыя, бальшавіцкія кадры.

Але было-б вялікай памылкай гаварыць, што сярод гэтай перадавой часткі рабочае клясы няма асобных элемэнтаў, якія пралезьлі ў партыю з асабістымі мэтамі, элемэнтаў, якія разлажыліся і адбіваюць варожыя настроі і ідэалёгію. У задачу праверкі і чысткі вытворчых ячэек і ўваходзіць ачысьціцца ад гэтых элемэнтаў, яшчэ больш узьняць аўтарытэт партыі ў вачох рабочых мас, яшчэ больш узьняць баяздольнасьць пралетарскіх кадраў партыі.

Таму трэба мабілізаваць увагу партыйных арганізацый наўкола чысткі вытворчых ячэек КП(б)Б Менску, якая пачнае толькі разгорвацца. З 58 вытворчых ячэек скончана чыстка толькі ў трох ячэйках. Улічваючы памылкі і

Рабочы т. Хвалей, маючы 42-хгадовы вытворчы стаж, падаў заяву аб уступленьні у партыю.

дасягненьні чысткі гэтых ячэек, зрабіўшы з гэтага пэўныя ўрокі, мы зможам яшчэ з большым посьпехам і выразна правесьці праверку асноўнай масы вытворчых ячэек Менскай партарганізацыі.

Урокі праверкі і чысткі трох вытворчых ячэек і матар'ялы, якія дала нам апошняя нарада сакратароў вытворчых ячэек КП(б)Б супольна з праверкомамі, даюць нам магчымасьць зрабіць некаторыя заўвагі.

Ячэйкі ў асноўным здавальняюча правялі падрыхтоўчую работу (партканкляктыў 1-й дзярждрукарні), частка-ж ячэек падрыхтоўку правяла фармальна.

Нават былі такія факты, калі асобныя ячэйкі зусім не прапрацавалі інструкцыю ЦКК УсеКП(б) аб чыстцы (ячэйка КП(б)Б каўбаснай фабрыкі). Палітычныя задачы чысткі і асноўныя прынцыпы праверкі ў гэтых ячэйках не прапрацаваны і не папулярызаваны.

І таму ня дзіва, калі члены партыі на першым-жа сходзе па чыстцы задаюць наступныя пытаньні: «А ці прайшоў чыстку сам праверком».

Рабкоры, прафактыў, дэлегаткі, камсамольскія ячэйкі яшчэ ня прымаюць патрэбнага ўдзелу ў праверцы ячэек. Трэба адзначыць, што пытаньні чысткі ня ўвязаны з умовамі прадпрыемства, што ў радзе выпадкаў адбіваецца на правядзеньні праверачных сходаў. Сакратаром гэтых ячэек патрэбна тэрмінова арабіць усё магчымае, каб зьнішчыць недахопы, якія перашкаджаюць нармальнаму ходу праверкі.

Адным з самых сур'ёзных недахопаў у практыцы чысткі аьцўлялецца тое, што задачы вярбоўкі перадавых рабочых і работніц у партыю не знайшлі патрэбнага адлюстраваньня ў рабоце вытворчых парт'ячэек. Многія ячэйкі не ўсьвядомілі палітычнай важнасьці задачы—скарыстаць чыстку партыі для максымальнага ўзмацненьня вярбоўкі. Практычна гэта задача некаторымі вытворчымі ячэйкамі не ажыцьцёўлена. Ячэйка каўбаснай фабрыкі за 6 месяцаў не завербавала ў партыю ні аднаго рабочага. Ячэйка пагельні Белдзяржбуду за 6 месяцаў прыняла ў партыю толькі 6 рабочых у той час, калі на прадпрыемствах працуе каля 700 рабочых ад варштату. Не расьце таксама ячэйка КП(б)Б Гандальбуду, ня гледзячы на тое, што на пабудовах Гандальбуду працуе каля 1.000 рабочых будаўнікоў.

Адсюль вынікае задача бездакладна выправіць гэты недахоп і ў часе чысткі вытворчых парт'ячэек пырока разгарнуць вярбоўку перадавых рабочых, удар нікаў сацыялістычнага спаборніцтва.

Першыя вынікі чысткі вытворчых парт'ячэек паказалі, што ня ўсюды, не на ўсіх праверачных сходах было забясьпечана ажыцьцяўленьне лёзунгу партыі аб самакрытыцы. Там, дзе ячэйкі пырока разгарнулі самакрытыку і крытыку, там наглядалася вялікае наведваньне сходаў і актыўнасьць прысутных. Наадварот, там дзе задачы самакрытыкі ня былі папулярызаваны, як належыць, і не праводзіліся практычна, праверачныя сходы праходзілі пры слабой актыўнасьці з боку беспартыйных рабочых і нават партыйцаў.

Праверка ячэйкі цагелень паказала, што да праверачных сходаў самакрытыка ў ячэйцы ня была разгорнута. Пэўны рад пытаньняў не стаяў на абгаварэньні рабочых мас (дзейнасьць рабачкому, выдучанства і г. д.). З прычыны слаба праведзенай работы рабочыя цагелень не ўсьвядомілі важнасьць бесьперапынкі. У выніку пераход на бесьперапынку выклікаў шмат непаразуменьняў. Слабая актыўнасьць з боку прысутных мела месца і на сходзе на праверцы і чысткі гуты «Пралетарыя». Паказальна, што на сход па чыстцы гэтай ячэйкі ня прышоў ні адзін камсамолец.

Чыстка выяўляе наколькі вытворчыя парт'ячэйкі прымаюць удзел у гаспадарчым жыцьці прадпрыемства. Як высьветлілася, асобныя ячэйкі прымаюць слабы ўдзел у вытворчым жыцьці фабрык і заводаў. У ячэйцы цагелень няма ніякіх вестак аб выпіках сацыялістычнага спаборніцтва. Невыстарчальна рэалізавана 3-я пазыка індустрыялізацыі. Вытворчая праграма поўнасьцю ня выканана. Расьце брак, слаба працуюць вытворчыя нарады, прапоўная дысцыпліна кульгае на абедзьве нагі. Усё гэта выразна сьведчыць, што нытаньні гаспадарчага жыцьця цагелень не атрымалі патрэбнага адлюстраваньня ў практыцы ячэйкі. У гэтым напрамку трэба адзначыць парт'ячэйку галянтарэйнай фабрыкі. Першыя сходы па чыстцы ячэйкі КП(б)Б галянтарэйнай фабрыкі паказалі, што сярод рабочых і асобных камуністых ёсьць выпадкі рваціна і вытворчай недысцыплінаванасьці. На фабрыцы выпускаецца прадукцыя дрэннай якасьці.

Ячэйка каўбаснай фабрыкі зусім ня прымала ўдзелу ў кіраўніцтве сацыялістычным спаборніцтвам. На фабрыцы і па сёньнішні дзень няма ні аднэй ударнай брыгады.

Ясна, што чыстка павінна прайсьці пад знакам праверкі гаспадарча-палітычнай работы вытворчых ячэек. У часе чысткі павінна быць яшчэ больш узмоцнена барацьба з рвачамі і прагульшчыкамі, за штарэсы сацыялістычнай вытворчасьці, за разгортваньне спаборніцтва і арганізацыю новых ударных брыгад. Чыстка павінна паказаць, наколькі дапая вытворчая парт'ячэйка справілася з усімі гэтымі задачамі.

НІКАНОРАЎ.

Вярбоўку—на рэйкі сыстэматычнай работы

Скарыстаць практыку Самахвалавіцкага райкому



Група батракоў Самахвалавіцкага раёну, якія падалі заявы аб уступленьні у партыю

Самахвалавіцкі раённы камітэт партыі (Меншчына) правёў каштоўнае і карыснае мерапрыемства, якое павінна прыкаваць увагу ўсіх партыйных арганізацый Беларусі. Раённы камітэт у сьнежні склікаў двухтыднёвыя курсы па падрыхтоўцы батракоў да ўступленьня ў рады партыі. Асноўнай мэтай курсаў аьцўлялася падрыхтоўка батрацкага актыву да ўступленьня ў КП(б)Б. Напярэдадні работы курсаў была праведзена шырокая агітацыйная - растлумачальная падрыхтоўка. Гэта забясьпечыла поўнае выкананьне тых задач, якія ставіў раённы камітэт партыі перад курсамі. З 40 батракоў, выкліканых на курсы, зьявілася 34, з якіх 18 батракоў і 16 батрачак. Большасьць батракоў працуе ў кулацкіх гаспадарках. На курсах была распрацавана папулярная праграма палітычнай адукацыі. Праводзіліся гутаркі на падставе падручніка «Азбука ленінізму». Побач з гэтым прапрацоўваліся пытаньні нацыянальнай палітыкі партыі, задач саюзу с.-г. рабочых, пастановы лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) і г. д. Пасьля сканчэньня курсаў была наладжана экскурсія ў Менск.

У выніку работы курсаў 12 батракоў і 7 батрачак уступілі ў рады партыі. Рэшта-ж батракоў ня ўступіла ў партыю толькі таму, што раённы камітэт ня мог іх зацьвердзіць з прычыны маладога ўзросту. Гэтыя таварышы ўступаюць у камсамол. Цікава, за лік каго вырасла Самахвалавіцкая арганізацыя пасьля сканчэньня работы курсаў. Сярод прынятых у партыю батракоў ёсьць т. т. Хвалей Патап — батрак, працуе на сельскай гаспадарцы 42 гады; Хмялеўская — 16 год батрачыць, Арцёмчык — батрак, працуе на найме звыш 14 год. Канаш, Атрасава і г. д. Большасьць таварышоў зьяўляюцца актыўнымі грамадзкімі працаўнікамі. Частка таварышоў прымала ўдзел у грамадзянскай вайне.

Курсы паказалі, што сярод батрацтва ёсьць вялікае імкненьне і шчырае жаданьне ўступіць у рады КП(б)Б. Але побач з гэтым высьветлілася, што многія ячэйкі амаль нічога ня робяць па вярбоўцы батракоў у рады партыі. Батрацтва стаяла ў баку ад масавай работы партыйных ячэек. Работа па вярбоўцы зусім заняпала. Толькі гэтым можна тлумачыць той факт, што за дна тыдні работы курсаў у партыю прынята ў 6 раз больш батракоў, чым Самахвалавіцкая партарганізацыя завербавала батракоў у партыю за ўвесь год.

Многія ячэйкі зусім ня ведаюць батракоў, якія працуюць у іх раёне. Напрыклад, Капінінская ячэйка КП(б)Б у асобе свайго сакратара катэгарычна адмовілася накіраваць батракоў на курсы з прычыны таго, што «ў нашым сельсавеце батракоў няма». Гэта якраз тая ячэйка, якая ў адказ на пытаньне раённага камітэту аб барацьбе з канкрэтнымі правямі правага ўхілу ў ячэйцы дала літаральна наступны адказ: «Капінінская ячэйка паведамляе, што ніякіх ухілаў не заўважвалася». Справа дайшла нават да такіх кур'ёзаў, што раённаму камітэту прышлося паказваць ячэйцы, дзе знаходзяцца яе батракі.

Такім адносінам да задач вярбоўкі батракоў у партыю трэба раз назаўсёды паклясьці канец. Самахвалавіцкая партарганізацыя павінна замацаваць посьпехі курсаў і яшчэ больш разгарнуць вярбоўку перадавых батракоў у рады КП(б)Б.

МЗЕРОВІЧ.

Дзесяць год саюзу працмастацтва

Сёньня саюз працмастацтва сьвяткуе 10-цігодзьдзе свайго існаваньня. Культпаход, які праведзены саюзам у сувязі з яго юбілеем, зьяўляецца, бязумоўна, адным з лепшых форм змычкі работнікаў нашай пралетарскай культуры з рабочымі масамі. Абслужана ў дні культпаходу 7.800 рабочых буйнейшых фабрык і заводаў Менску пры актыўным удзеле 380 чалавек работнікаў мастацтва. Гэта лічба немалая. Яна сьведчыць аб тым, што асноўная маса гэтага атраду культурнай рэвальцыі добра ўцяміла, якія задачы стаяць перад імі ў пэрыяд рэканструкцыі нашай гаспадаркі, у пэрыяд непасрэднай барацьбы мільёнаў працоўных за сацыялізм.

Толькі фабрыка і завод, толькі такія формы і мэтады, як сацыялістычнае спаборніцтва, ударныя брыгады і ударныя цэхі, рабочыя брыгады, што ідуць у вёску для кіраўніцтва і садзейнасьці магутнаму нябываламу калгаснаму руху,—толькі яны ствараюць глебу для мастака, рэжысэра, актора, музыкі, каб гэтыя вобразы пасадзьнялістычнаму жыцьцёвіцу у мастацкую форму і ператварыць іх у зброю барацьбы за сацыялістычнае грамадзтва, за новага чалавека, за культурны быт.

Калі ўзяць, напрыклад, нашы беларускія дзяржаўныя тэатры, дык у іх яшчэ і раней вызначыліся пераломы ў гэтым напрамку: адлюстраваць жыцьцё фабрыкі, выявіць яе ўпутраныя кантрасты, аддзяліць элемэнты новага сацыялістычнага ад старога нявольніцкага, абломаўскага. Узяць хаця-б «Зяняюць верацёны» (БДТ 1), «Барацьба машын» (ЯДТ), «На прадвесьні» (БДТ 2)—усё гэта, бязумоўна, значны крок уперад, але зараз ужо прапаганда сацыялістычнага будаўніцтва праз такія мастацкія малюнкі ня можа задаволіць рабочага глядача ні сваім зьместам, ні сваёй формай.

Новага, што адрозьнівае ў асноўным малюнкі, правы, элемэнты рэканструкцыйнага пэрыяду ад адбудоўчага,—гэтага мы пакуль што яшчэ ў нашых тэатрах ня маем.

Мы можам быць упэўнены, што працаўнікі мастацтва, пад кіраўніцтвам нашай партыі, па гэтым шляху і пойдуць.

Б. Табайнік.

У пятніцу, 27 сьнежня, а 7 гадз. увечары ў клюбе хлебазаводу (Ракаўская, 20), ЦП саюзу харчавікоў, вытворч. камісія хлебазаводу сумесна з ЦП саюзу саўгандалькслужачых, праўленьнем і эканом-бюро МПРК склікаюць шырокую нараду рабочых хлебазаводу сумесна з работнікамі прылаўка і рабочых аддзяленьняў хлебазаводу з наступным парадкам дня:

1) Даклад Наркамгандлю аб стане хлебнага рынку.

2) Даклад дырэктара хлебазаводу аб якасьці хлеба.

Запрашаюцца прадстаўнікі РСІ, друку, хлебнай інспэкцыі, рабочыя млынаў і УМТ'а.

Перадавыя рабочыя ўступаюць у партыю

Гэтымі днямі скончылася праверка ячэйкі дзяржаўнай гарбарні імя Ленерта (Магілеў). Чыстка выявіла рад асноўных дасягненьняў і недахопаў у рабоце ячэйкі. За апошні час ячэйка дабілася поўных посьпехаў у партыйна-палітычнай і гаспадарчай рабоце. Камуністыя прымаюць актыўнейшы ўдзел у вытворчым жыцьці прадпрыемства. Гэта асабліва стала адчуваецца, калі гарбарня ўступіла ў сацыялістычнае спаборніцтва. Партыйцы ў сваёй асноўнай масе зьяўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі спаборніцтва на прадпрыемстве. Вынікі відавочныя. Вытворчая праграма выканана на 109 проц. Сакспаборніцтва дало 55.000 руб. эканоміі.

Ня мала сіл ячэйка патраціла на правядзеньне гаспадарча-палітычнай кампаніі. У гэтым напрамку была праведзена шырокая агітацыйная работа. У выніку поўнасьцю выканана заданьне па рэалізацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі. Ячэйка прымала ўдзел у пасеўнай кампаніі, хлебазагатоўках, перавыбарах саветаў і г. д.

Рабочы Хлебазаводу т. Суравец, працуе на вытворчасьці 8 год, падаў заяву аб уступленьні у партыю.

Партыйцы прапрацоўвалі важнейшыя пастановы партыі. Да прапрацоўкі былі прыцягнуты беспартыйныя рабочыя. Але побач з гэтым, чыстка паказала, што ў ячэйцы яшчэ маюць месца некаторыя памылкі і хібы. Сур'ёзьнейшым з іх зьяўляецца тое, што дырэктывы партыі аб крытыцы і самакрытыцы прапрацаваны слаба. У выніку заўважваліся выпадкі непаразуменьня сутнасьці самакрытыкі і скажэньня яе асноўных лёзунгаў. Напрыклад, мела месца нездаровае рэагаваньне на рабкораўскія заметкі ў насьценнай газэце з боку партыйнага-адміністратараў. Той факт, што з 85 членаў і кандыдатаў партыі, якія прайшлі праверку, ніхто ня выключаны, зьяўляецца лепшым паказальнікам ідэалёгічнай устойлівасьці і здаровага стану партарганізацыі. Чыстка ўнесла глыбокі пералом у разгортваньне вярбоўкі ў рады партыі перадавых рабочых і работніц. Пасьля чысткі 10 лепшых рабочых і адна работніца ўступілі ў партыю. З іх 6 рабочых маюць 13-15-цігадовы стаж. Таварышы Лабанаў і Цуканаў, якія ўступілі ў партыю, у мінулым змагаліся на франтох грамадзянскай вайны. Яны былі партызанамі і чырвонагвардзейцамі.

Зыськін.

Хроніка росту партыі

Перад пачаткам праверкі і чысткі ячэйкі КП(б)Б фабрыкі «Х Кастрычнік» (магілеўшчына), 7 перадавых рабочых падалі заявы аб прыёме ў рады партыі. Чыстка ячэйкі праходзіць пры актыўным удзеле беспартыйных рабочых і работніц. Гэта зьяўляецца лепшай зарукай таго, што ў выніку чысткі новыя кадры пралетараў уступяць у партыю.

***

Магілеўскі чыгуначны парткалектыў падрыхтоўчую работу да чысткі цесна ўвязаў з задачамі вярбоўкі. У выніку да пачатку чысткі ў партыю ўступіла 8 лепшых рабочых. У часе праверкі 12 рабочых падалі заявы аб прыёме ў рады партыі.

Антысэміцкая вылазка у вагонных майстэрнях

Бюро парт'ячэйкі і мясцкому змазалі палітычную сутнасьць справы

Кастрычніцкі раённы камітэт партыі скончыў вырашэньне справы аб правах антысэмітызму ў вагонных майстэрнях ст. Менск таварн.

Выяўлены наступныя акалічнасьці гэтае справы.

Нядаўна ў памяшканьні вагонных майстэрань (ст. Менск, таварная МБВ чыг.) быў зьбіты рабочы яўрэй т. Гелер. Тав. Гелер зайшоў у мясцком, каб узяць некаторыя даведкі ў сакратара камсамольскай ячэйкі Мяхедка, але гэтых даведак ён не атрымаў. Неўзабаве група рабочых на чале з Мяхедка, сярод якіх былі камуністыя і камсамольцы, паваліла Гелера на падлогу і зьбіла яго. Зьбіты рабочы каля 40 мінут ляжаў без усялякага руху на падлозе. Потым абнаглелы Мяхедка разам з іншымі асобамі абліў Гелера вадой і загадаў яму ісьці працаваць да варштату. Аднак, упэўніўшыся, што Гелер страціў прытомнасьць, яго на насілках аднесьлі ў больніцу.

З Гелера зьдзекваліся ня першы раз. Група антысэмітаў сыстэматычна цкавала тав. Гелера, які працаваў на чыгунцы каля рубільнага варштату. Апошнія месяцы 1928 году і першыя месяцы 1929 году былі часам сыстэматычнага цкаваньня і наглых зьдзекаў з т. Гелера. Яго ў часе работы абзывалі ганебнымі антысэміцкімі словамі.

Дзе-ж хаваецца прычына гэтага недапушчальнага і агіднага цкаваньня рабочага - камсамольца т. Гелера. Сутнасьць справы заключаецца ў тым, што група асобных рабочых, сярод якіх ёсьць камуністыя і камсамольцы, не магла дараваць Гелеру тое, што ён зьяўляецца яўрэем. Гэтыя антысэміты, скарыстоўваючы бяздзейнасьць у гэтым напрамку партыйнага і прафесыянальнага кіраўніцтва вагонных майстэрань, не сустракаючы жорсткага і своячасовага адпору, ператварыла агідныя «жарты» па адрасе Гелера ў сыстэму наглага і абуральнага цкаваньня і зьдзекаў. Характэрна, што не мясцком, а рабочыя актывісты на сваёй уласнай ініцыятыве ўзьнялі пытаньне аб недапушчальнасьці зьдзекаў з т. Гелера. У выніку мясцком абвясьціў вымовы антысэмітам Кавалеўскаму, Рублеўскаму і інш., якія займаліся сыстэматычным цкаваньнем т. Гелера. 4 рабочыя былі пераведзены за антысэміцкія ўчынкі ў іншыя брыгады. Паводле пастановы мясцкому пытаньне аб правах антысэмітызму і зьдзеках з т. Гелера павінна было быць абмеркавана на агульным сходзе рабочых вагонных майстэрань.

Але гэта пастанова загінула ў нетрах мясцкомаўскіх пратаколаў. Ужо прайшло больш за 8 месяцаў, але пытаньне наконт зьдзекаў з т. Гелера не абмяркоўвалася на рабочым сходзе. Гэта зьяўляецца вялізарнай палітычнай памылкай мясцовага камітэту.

Зьдзеквіліся ня толькі з т. Гелера, цкавалі і іншых рабочых-яўрэяў. Камуністы Комша зрабіў нялы антысэміцкі выпад супроць партыйца т. Міленькага. Пытаньне разглядаецца на бюро ячэйкі і выносіцца пастанова, якая больш падобна на анэкдот, чым на сапраўднасьць. Бюро ячэйкі ўхвалила паставіць на від т. т. Комшу і Міленькаму. Цікава, у чым-жа вінаваты Міленькі, што яго Комша ня толькі абляў, але і выказаў да яго, як яўрэя, яўную нацыянальную варожасьць.

У сьвятле гэтых фактаў яшчэ больш выяўляецца блізарукасьць мясцкому, які ня бачыў у гэтых фактах ніякіх праяў антысэмітызму і лічыў іх простымі «жартамі».

Разам з мясцкомам не рэагавалі на антысэміцкія вылазкі і бюро партыйнай і камсамольскай ячэек. Ня дзіва, што яны спакойна прайшлі міма паўторнай антысэміцкай вылазкі супроць т. Гелера. У жніўні хуліган Барташэвіч, які, да рэчы, зьяўляецца... камсамольцам, зьбіў т. Гелера пры выкананьні ім грамадзкіх абавязкаў. Грамадзкія арганізацыі ў Менску (акругком МОПР'у і ячэйка МОПР'у вагонных майстэрань) патрабавалі прыцягненьня Барташэвіча да крымінальнай адказнасьці. Але суду ня было. Барташэвіч пры дапамозе пагроз прымусіў Гелера не падаваць заяву ў суд. І вось міма такога агіднага факту прайшло партыйна - камсамольскае кіраўніцтва вагонных майстэрань.

Вылазцы клясавага ворага рабочыя масы ладуць жорсткі адпор.

Пралетары - чыгуначнікі заўсёды давалі адпор гэтым хітрыкам клясавага ворага і выкрывалі іх сапраўдную сутнасьць.

Раённы камітэт партыі даў належную палітычную ацэнку фактам, якія мелі месца ў вагонных майстэрнях. Ухвалены рад мер па рашучым і глыбокім узмацненьні інтэрнацыянальнай работы сярод рабочых - чыгуначнікаў. Побач з гэтым РК зрабіў рад арганізацыйных вывадаў. Бюро ячэйкі вагонных майстэрань распушчана. Узьнята пытаньне аб роспуску бюро ячэйкі ЛКСМБ і мясцкому. Членам бюро парт'ячэйкі старога складу за замазваньне фактаў антысэмітызму пастаўлена на від.

Уп. МЯЖЭВІЧ.

За дзейснасьць асноўнага лёзунгу партыі

Патрэбна выразная лінія ў барацьбе за самакрытыку

Усімі прызнана, што рад апартуністычных скажэньняў на практыцы ў рабоце зямельных, фінансавых і інш. органаў — ёсьць вынік слабога разгортваньня самакрытыкі, слабой пільнасьці асобных партарганізацый па іх папярэджаньні Верасьнёўскі пленум ЦК КП(б)Б сказаў гэта з усёй сваёй рашучасьцю.

Яшчэ больш рэзка паставіў пытаньне аб асобных задачах і адгазнасьці органаў ЦКК-РСІ ў барацьбе за самакрытыку апошні пленум ЦКК УсеКП(б), які папярэдзіў нашы КК-РСІ, што прадуленьні слабасьці, патураньня і непрыпучасьці ў барацьбе за выразную лінію партыі будуць разглядацца, як выключна недапушчальныя дзеяньні, якія цягнуць за сабой зьняцьце з пастоў падобных «ліберальных» дзеячоў КК-РСІ.

За апошні час ЦКК КП(б)Б вядзе вялікую работу па праверцы работы АКК-РСІ з тым, каб дапамагчы нашым АКК-РСІ прыясьці сваю дзейнасьць у поўную адпаведнасьць з задачамі партыі. Асабліва пільная праверцы пры гэтым падлягае лінія работы АКК па барацьбе з парушэньнямі лёзунгу партыі аб самакрытыцы.

Гэта асабліва сур'ёзная ўвага да данай лініі зразумела таму, што ўсякае паслабленьне самакрытыкі цягне за сабой паніжэньне актыўнасьці мас у барацьбе з бюракратызмам, з нашымі хібамі.

Віцебская партарганізацыя атрымала належныя ўрокі на апошніх «самакрытычных» спрасах, у выніку ўмяшаньня ЦКК КП(б)Б. Гэта «нагляднае навучаньне», як трэба змагацца з парушэньнямі самакрытыкі, адыграла вялікую ролю ў справе далейшага разгортваньня самакрытыкі. Нашумелая справа скрпраўленьня саюзу мэдсанрацы, якое правяла нязгодзьнасьць да барацьбы з апартуністычнымі скажэньнямі ў ніжэйшых установах, выкрыцьцё недапушчальныя скажэньні ў Высачанкім, Сурасім і інш. раёнах, слабое разгортваньне самакрытыкі на панчоншпаганьнем і не асудзіла недапушчальных адносін камісіі і РК. Толькі цяпер, пасьля работы камісіі ЦКК, гэта справа была выкрыта, і ўся пастанова скасавана, як накіраваная супроць самакрытыкі.

У якасьці адной з прылад замаху на самакрытыку мы часта бачым такога роду маноўры глушыцеляў. У адказ на тую ці іншую заметку, або выкрыцьцё зварачаюцца да матаду «дымавых заслон». Пачынаюцца гутаркі, хто гэты аўтар, рабкор, ці ня мае ён таксама недахопаў, хто яго прабабушка і інш. Пасьля-ж таго, калі якая - небудзь прычэпка знаходзіцца, абараняюць нытаньне аб заметцы ў пытаньне аб рабкоры. Тым самым заметка, выкрыцьцё змазваецца, адводзіцца на другі плян, або забываецца. Можна паказаць на два віцебскія прыклады з селькорам Заявоай, які вёў актыўную барацьбу праз прэсу з кулацкім засільлем, з скажэньнем клясавай лініі ў кіраўніцтве мясцовых органаў. Яго ўсяляк цкавалі асобныя члены партыі, абвяшчалі яго антысавецкім элемэнтам, разам з мясцовым папом, якому нават былі з прыемнасьцю адкрыты старонкі насьценнай газэты, куды поп даў верш, які ганьбіў селькора з пункту погляду... праваслаўнай веры і хрысьціянскай маралі. Рабкора Канцэпольскага за тое, што той выкрыў безгаспадарчасьць у працкалектыве, загадчык стаў ганьбіць і прасьледаваць спасыланьнямі на тое, што ён чужы элемэнт, бо ў пэрыяд перапынку па беспрацоўі, ён працаваў зборшчыкам ануч. У абодвых выпадках патрэбна было ўмяшаньне РСІ, каб асадзіць заядлых глушыцеляў.

Не менш паказальныя гомельскія прыклады. Рабочы Маркаў (лесазавод), які мае 20-ці гадовы рабочы стаж, апошнія два гады стаў актыўным рабкорам, выкрываў на заводзе факты сямейнасьці, дрэнных адносін да вытворчасьці, атрымліваў прэмії за свае прапановы. Тады сталі на яго сыпацца заявы аб тым, што ён хуліган, п'яніца, антысавецкі элемэнт. РСІ расьсьледавала і знайшла, што ў яго мінулым сапраўды былі нетактычныя ўчынкі, але цяпер ён прыкладны рабочы, і выступленьні супроць яго носяць характар на-

меткамі. Пастановай РСІ, аднак, не задавольваюцца, ледзь не на наступны дзень супроць яго высоўваюцца тыя-ж абвінавачаньні, зноў зьмяшчаецца грамавая заметка ў «Полесской Правде» і з хуткасьцю, з якою ніколі ня судзяць бюракратаў, валакітчыкаў, прысуджваюць рабочага да 4 месяцаў зьняволеньня. Вярхоўны суд правярае справу, касуе прыгавор і перадае на новы разгляд. Піто-ж выяўляецца? Маркава апраўдваюць, лічачы абвінавачаньне недказаным. Мы зусім згодны з тым абурэньнем наконт падобнай лініі «Полесской Правды», якое было выказана гэтымі днямі «Зьвяздой».

Ужо шырока асьвятляліся «Зьвяздой» рэчыцкія (Гом. акр.). факты, дзе за заметку аб сакратары яч. фабрыкі «Дняпро» пагражалі «Полесской Правде» судом, дзе члена партыі, які адважыўся ставіць пытаньне інакш, абвінавацілі ў трацкізьме і палітычных хістаньнях, дзе на рабочым сходзе дэхту з ведама ячэйкі абвясьцілі вымову рабочаму за заметку ў насьценгазэце, супроць рабкора ўзбуджалі судовыя справы «за паклёп» толькі за тое, што той перадаў у харнікёрскай заметцы ў газэце тое, што гаварылі беспартыйныя рабочыя і члены партыі на сходзе перад чысткай, другога рабкора на лесазаводзе ім. Томскага парт'ячэйка назвала «склочнікам», а ў насьценгазэце зрабіла з яго страшыдла—растратчыка, злачынцу,—усё, што толькі можна было прыдумаць.

На заводзе «Рухавік Рэвалюцыі» (Гомель) на справе аб ганьбіні на рабкора Крыштафука райком, ня гледзячы на наяўнасьць такога ганьбіньня, ня даў выразнай дырэктывы і пастаноў, а абмежаваўся тым, што напісаў вялікі пункт аб барацьбе са склокамі: «Весьці рашучую барацьбу з рознымі склокамі сярод членаў ячэйкі... ужываючы меры спагнаньняў да замешаных у склоках, папярэджыўшы таварышоў, што калі склокі будуць працягвацца, яны ставяць сябе за радамі партыі і г. д., і г. д. Пытаньне-ж аб самакрытыцы было толькі дадаткам да пункту аб склоках, як быццам самакрытыка... ёсьць нейкая розна-відная ськлок.

У Менску рад рабкораўскіх спраў (Міхальцоў і інш.) таксама пачаліся а

камі «склочнік» і інш. Практыка разгляду цэлага раду спраў членаў партыі па абвінавачаньні іх у склоках, дае досыць красамоўнае пацьвярджэньне тэй думцы, што гэтай зброяй часамі карыстаюцца ў мэтах заціску самакрытыкі, унутрыпартый

Трыбожны сыгнал па Савецкай Беларусі

ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ СКІДВАНЬНЕ АБЛІГАЦЫЙ ПАЗЫК ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

Трэба мабілізаваць актыўнасьць рабочых мас на барацьбу са скідваньнем аблігацый пазык, трэба ўзмаціць растлумачальную работу сярод працоўных аб недапушчальнасьці падрыву фінансавай базы індустрыялізацыі краіны

Даклад прадстаўніка Наркамфіну на пасяджэньні прэзыдыуму ЦСПСБ выклікаў гарачыя пратэсты, правільней, ня сам даклад, а тон яго — спакойны, роўнадушны, «вытрыманы»... Між тым, справа з мабілізацыяй вольных сродкаў насельніцтва стаіць так дрэнна, што трэба біць трывогу, трэба мабілізаваць усю ўвагу і актыўнасьць рабочае клясы для барацьбы з радам надзвычайна адмоўных зьявішч у гэтай галіне.

Праўда, падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі, як паведаміў дакладчык, прайшла больш-менш добра. На 10-га сьнежня рэалізацыя 3-й пазыкі індустрыялізацыі на Беларусі дасягнула сумы ў 13.995.500 рублёў, што складае 155,5 проц. кантрольнай лічбы. Хаця, з другога боку, ахоп членаў прафсаюзаў, згодна вестак ЦСПСБ (у дакладчыка іх ня было) дасягае процантаў 80. Значыць, лёзунг аб 100-процантным ахопе членаў прафсаюзаў поўнай месячнай пэнсіяй ня выкананы.

Але справа ня столькі ў гэтым, колькі ў пытаньні аб замацаваньні пазык за насельніцтвам. Бо асноўная задача фінансавых устаноў і пралетарскай грамадзкасьці — не дапусьціць скідваньня пазык, г. зн. датэрміновага звароту аблігацый у дзяржаўныя касы і падрыву фінансавай базы індустрыялізацыі краіны. Гэтага зроблена ня было.

Лічбы, якія так спакойна прыводзіў дакладчык, гавораць аб поўнай абыякасьці, у першую чаргу, саміх фінансавых органаў, а потым і прафсаюзных арганізацый да пытаньня аб затрыманьні аблігацый раней рэалізаваных пазык на руках трымальнікаў.

На 1-га сьнежня 1929 г. скідваньне аблігацый масавых пазык дасягнула 2.858.000 руб., што складае 19 проц. агульнай сумы рэалізаваных масавых пазык. Скідваньне 2-й пазыкі індустрыялізацыі дасягнула 33 проц. Па асобных прафсаюзах становішча проста недапушчальнае. У будаўнікоў, напрыклад, наглядаецца такое зьявішча, што некаторыя сэзоньшкі адмаўляюцца ад далейшых плацяжоў па 3-й пазыцы індустрыялізацыі, замацоўваючы за сабой тую колькасьць аблігацый, за якую яны ўжо заплацілі.

Ведаючы аб гэтых пагражаючых зьявішчах, фінансавыя органы, тым ня менш, пават не падумалі аб сваячасовай сыгналізацыі і мабілізацыі актыўнасьці рабочых мас для барацьбы з гэтымі зьявішчамі. Т.т. Рыжоў, Аверын, Вайтэнка, Вашкевіч і інш., якія выступалі ў спрэчках, характарызавалі такія адносіны фінорганаў, як бюракратычныя і фармальныя.

Трэба неадкладна рэзка зьмяніць «спакойную плынь» работы фінорганаў у галіне барацьбы са скідваньнем аблігацый пазык. Трэба моцна ўдарыць і па тых прафорганах, якія нядбайна адносяцца да работы камісій садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ня цікавяцца тым, як прафсаюзная маса выконвае свае абавязкі па ўзмацненьні фінансавай базы індустрыялізацыі краіны.

Камісія, якая вылучана прэзыдыумам ЦСПСБ, для выпрацоўкі рэзалюцыі павінна распрацаваць рад канкрэтных мерапрыемстваў для стварэньня рашучага пералому ў гэтым пытаньні.

Недавыпрацоўка і брак паперы

ПАГРОЗА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЮ КУЛЬТУРНАЙ ПЯЦІГОДКІ

АДКРЫТЫ ЛІСТ ЦК САЮЗУ ДРУКАРОЎ

Да ўсіх рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу папяровай прамысловасьці

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

1-я аб'яднаная вытворчая канфэрэнцыя працаўнікоў паперы і друку, якая адбылася ў Ленінградзе г. г., канстатавала рад вялікіх недахопаў у якасьці паперы, спосабах яе транспартаваньня і захоўваньня яе, і намеціла канкрэтныя мерапрыемствы па зьнішчэньні недахопаў, якія меліся раней. Гаварылася, што, на падставе пастаноў канфэрэнцыі, мы дружна, напружана зможам дабіцца паляпшэньня ў гэтай справе. Аднак, на жаль, сапраўднасьць гаворыць другое, яна прымушае сур'ёзна непакоіцца, што найлепшыя пастановы нашай канфэрэнцыі застануцца толькі добрымі пажаданьнямі.

Якасьць паперы ня толькі не палепшылася, але ў некаторых выпадках нават пагоршылася. Наглядаюцца вялікія тольки плямы, дзіркі і маршчыны, склейка паперы, але і няроўнамерная праклейка, псаваньне паперы, пры надворнай цэласьці ўпакоўкі. Па некаторых фабрыках папера мае розную шчыльнасьць, няроўнамернае разьмеркаваньне валакон, дзякуючы чаму прапітваецца лакам, што робіць яе зусім непрыгоднай для друкаваньня.

Мы маем весткі аб недавыпрацоўцы па радзе фабрык намечанай вытворчай праграмы; бываюць частыя прыпыненьні і аварыі машын; ёсьць асобныя выпадкі, калі папяровыя фабрыкі пераходзяць на вырад больш высокіх гатункаў паперы, замест гатункаў, якія патрэбны краіне для выкананьня культурнапалітычных задач.

Прэзыдыум ЦК саюзу друкароў лічыць становішча ў папяровай прамысловасьці надзвычайна сур'ёзным, пагражаючым інтарэсам сацыялістычнага будаўніцтва і патрабуючым прыняцьця тэрміновых, мер да яго зьмяненьня і паляпшэньня і тады яго зьмяненьня і паляпшэньня і таму зварачаецца да ўсіх працаўнікоў папяровай прамысловасьці і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу і да ўсіх прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый папяровай прамысловасьці з гарачым заклікам прыняць самы актыўны ўдзел у барацьбе за паляпшэньне якасьці паперы, за павялічэньне прадукцыйнасьці працы і больш выпуск прадукцыі, за правільнае скарыстоўваньне машын і іх захаваньне, не пакідаючы без далейшага выяўленьня сапраўдных прычын і вінаватых нават у самай маленькай і на першы погляд нязначнай аварыі.

Прэзыдыум ЦК саюзу друкароў ад імя аб'яднаных ім рабочых выклікае рабочых і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал папяровых фабрык на сацыялістычнае спаборніцтва з паліграфічнымі прадпрыемствамі па наступных паказальніках: для працаўнікоў паперы — паляпшэньне якасьці прадукцыі і ўпакоўкі яе, павялічэньне выпуску прадукцыі яе і недапушчэньне аварый машын па выпрацоўцы паперы; для друкароў—эканомнае выдаткаваньне паперы, памяншэньне зрываў і браку і паляпшэньне сыстэмы захаваньня паперы.

Працаўнікі папяровай прамысловасьці! Дружнымі намаганьнямі ўсіх да аднаго забясьпечым выкананьне задач культурнай рэвалюцыі. Напружанай, ударнай працай пакажам ворагам нашу гатоўнасьць змагацца за сацыялістычную рэканструкцыю нашай краіны

Ні аднэй папяровай фабрыкі, якая-б ня была ахоплена саспаборніцтвам.

ПРЭЗЫДЫУМ ЦК ДРУКАРОЎ.

Да ўсіх рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу саюзу працаўнікоў паперы Беларусі

Прэзыдыум ЦП саюзу працаўнікоў паперы, разглядзеўшы на сваім пасяджэньні адозву ЦК саюзу друкароў да ўсіх працоўных папяровай прамысловасьці, пастанавіў зьвярнуцца да ўсіх працаўнікоў папяровай прамысловасьці Беларусі з наступным:

Неабходна, каб уся увага грамадзкасьці працаўнікоў папяровай прамысловасьці была зьвернута на абгаварэньне памянёнай адозвы. Вытворчыя нарады, шырокія сходы рабочых і служачых сумесна з адміністрацыйна-тэхнічным пэрсаналам фабрык павінны дэтальна абгаварыць пытаньні, што пастаўлены ў адозве, намецілы рад канкрэтных мерапрыемстваў для паляпшэньня якасьці і павялічэньня вырабу прадукцыі.

ЦП лічыць, што сыгнал, які нам дае ЦК саюзу друкароў ад імя працоўных друкароў, зьяўляецца правільным і сваячасовым, бо за час працы першага кварталу бягучага году мы маем па ўсіх, без выключэньня, прадпрыемствах Беларусі недавыкананьне вытворчай праграмы: сабекошт амаль ня зьнижаны, якасьць прадукцыі амаль зусім не палепшылася.

Зьвяртаючы ўвагу працаўнікоў папяровай прамысловасьці Беларусі, мы ўпэўнены, што працаўнікі папяровай прамысловасьці абгавораць гэтыя пытаньні і намецяць рад мерапрыемстваў па паляпшэньні якасьці прадукцыі. Працаўнікі папяровай прамысловасьці выканаюць узятыя на сябе абавязкі па саспадгаварох поўнасьцю і гэтым самым дадуць магчымасьць друкарам бесьперапынна працаваць і выканаць тыя палітычныя задачы, якія стаяць перад друкарамі ў культурнай рэвалюцыі і ў нашым сацыялістычным будаўніцтве.

Нам. Старшыні ЦСПСБ Станкевіч.
Кіраўнік спраў ЦП Мулярэвіч.

Да ўсіх і рабочых служачых паліграфічнай прамысловасьці

Цэнтральнае праўленьне саюзу друкароў, азнаёміўшыся з лістом ЦК нашага саюзу да ўсіх рабочых папяровай вытворчасьці і друкароў, салідарызуецца з яго зьместам і адначасова лічыць з свайго боку патрэбным завастрыць увагу ўсёй саюзнай арганізацыі друкароў Беларусі на цэлым радзе ненармальнасьцяй, якія маюць месца на нашых прадпрыемствах і ўстановах, што зьвязаны з нерацыянальнымі, а часта драпежнымі адносінамі да паперы, у якой мы маем такую вялікую патрэбу.

Тыражы газэт часта выпускаюцца без належнага ўліку магчымасьці збыту, з-за гэтага шмат газэт варочаецца назад. Наглядаюцца вялікія зрывы на паперы, асабліва ролевай. Недастаткова скарыстоўваюцца абрэзкі для друкаваньня дробных работ. Асабліва шмат браку паперы атрымліваецца па прычыне нядбайнасьці транспартаваньня: з фургонаў часта скідаюць няўважліва кіпы паперы, ад чаго яна вэцца, захоўваюць паперу ня ў будынку, ад чаго папера псуецца. Папера часта псуецца з-за кепскага друкаваньня, брашуровкі ды інш.

Нарэшце, часта наглядаюцца ў нас зусім недапушчальныя адносіны рабочых да паперы: паперу псуюць, выціраюць ёю рукі і г. д.

Улічваючы ўсе гэтыя зьявішчы, што маюць месца на нашых прадпрыемствах, ЦП саюзу друкароў зварачаецца да ўсіх арганізацый і да ўсіх рабочых і служачых нашага саюзу абмеркаваць гэтае пытаньне ў масавым парадку (ВК, ВН, ЧКК), для таго, каб больш рацыянальна і эканомна выкарыстоўваць паперу і вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы ў гэтым кірунку.

Нам. старшыні ЦП Рэсін.
Алк. сакратар Брэнэйзан.

Сьвята „лікбезу" Гомелі

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). 26-га сьнежня ў дзень 10-цігодзьдзя выданьня дэкрэту аб ліквідацыі няпісьменнасьці адкрываецца акруговы зьезд таварыства «Прэч няпісьменнасьць». Ва ўсіх навучальных установах будуць праведзены раніцнікі і гутаркі, прысьвечаныя юбілею.

На Савецкай Беларусі

ШПАРКІ ТЭМП КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ АРШАНШЧЫНЫ

Ляднянскі раён цалкам калектывізаваны. Падрыхтоўка калгасаў да сяўбы нездавальняючая

На 20-га сьнежня плошча, занятая пад калектывы ў Аршанскай акрузе, дасягнула 31,8 проц. ад агульнай плошчы акругі. На 15-га лістапада было калектывізавана ўсяго 14,5% плошчы акругі.

Ляднянскі раён на сёнешні дзень калектывізаваны ўжо на ўсе 100%.

З посьпехам ідзе калектывізацыя ў Круглянскім раёне, плошча якога калектывізавана на 20-га сьнежня на 90%. Між тым, на 15-га лістапада па Круглянскім раёне налічвалася толькі 37,8% калектывізаванай плошчы.

Побач з вялікімі посьпехамі калектывізацыі ў большасьці раёнаў некаторыя раёны Аршанскай акругі ўсё яшчэ адстаюць. Калектывізацыя Аршанскага раёну, напрыклад, складае ўсяго 9,2%, а Багушэўскага — толькі 4,7%.

Падрыхтоўка да веснавой сяўбы ў калгасах яшчэ не разгарнулася. Асабліва дрэнна з ачысткай насеньня. У новых калгасах яна амаль яшчэ не пачалася. Старыя-ж калгасы ачысьцілі насеньне ўсяго на 40%.

Звышнармальны продаж жывёлы за апошнія дні некалькі зьнізіўся ў выніку прынятых калгаснымі органамі мер. Вялікую карысьць прынесла пастанова Калгасцэнтру БССР, якая забараняе прымаць у калгасы тыя гаспадаркі, якія разбазараваюць сваю жывёлу. На падставе гэтае пастановы калгасы пры прыёме новых гаспадарак у свой склад патрабуюць, каб у гаспадарках была ў наяўнасьці та колькасьць жывёлы, якая адзначана ў акладным лісьце.

Напаўненьне стада калгасаў ідзе вельмі марудна. Да апошняга часу калгасы атрымалі толькі каля 200 кароў.

Прафсаюзы нічога канкрэтнага яшчэ не зрабілі ў справе выкананьня дырэктывы аб вылучэньні рабочых на калгасную работу. Усё яшчэ ідуць гутаркі. Аршанскі акруговы Калгасаюз рабочых яшчэ не атрымаў.

У першым раёне суцэльнай калектывізацыі

КЛІМАВІЧЫ. (Наш. кар.). Скончана суцэльная калектывізацыя Клімавіцкага раёну. Дзень сканчэньня калектывізацыі абвешчаны днём масавай праверкі і ўзмацненьня калгасаў.

Калгасы занялі 110 тыс. гэкт. зямлі, больш за 60 тыс. беднякоў і серадняковаў аб'яднаны ў буйныя калгасы, плошчай ня менш 2.000 гэкт. кожны.

Буйнейшы ў БССР калгас «Бальшавік Беларусі» імя ЦК КП(б)Б займае плошчу 30.000 гэкт. І аб'ядноае 52 вёскі. Ганаровым старшынёй гэтага калгасу выбраны генэральны сакратар ЦК УсеКП(б) т. Сталін.

Ва ўсіх калгасах вядзецца падрыхтоўка да веснавой сяўбы: зьбіраецца і ачышчаецца насеньне, аграмаджваецца рабочая жывёла і с.-г. інвэнтар, наладжваюцца вытворчыя нарады, праводзіцца ўлік маемасьні. Да 70% калгасаў зрабілі калектыўнае заворваньне палёў і засеў азімага кліну.

Ідзе ломка старога закасьцянелага быту. Паводле дамаганьняў насельніцтва, закрыта 7 цэркваў і сынагог, памяшканьні іх перададзены пад клюбы й хаты-чытальні.

У калгасы ўліта 230 камуністых і 650 камсамольцаў.

14 вясковых ячэек КП(б)Б рэарганізаваны ў калгасныя, арганізаваны 6 новых калгасных ячэек.

Зараз усе сілы партыйных і савецкіх арганізацый і батрацка-бядняцкага актыву мабілізаваны для ўзмацненьня калгасаў і наступленьня на клясавага ворага.

40 новых вэтэрынарных лячэбніц

ВЭТЭРЫНАРНЫЯ ВУЧАСТКІ Ў КАЛГАСАХ

Сёлета на правядзеньне розных мерапрыемстваў па вэтэрынарыі адпушчана па бюджэце 1.660 тыс. рублёў, замест леташніх 806 тыс. руб. У раёнах будзе пабудавана 40 новых вэтэрынарных лячэбніц з разьліку 5 лячэбніц на акругу. Сетка вэтэрынарных вучасткаў пашыраецца на 71 адзінку. Значная частка вэтэрынарна - доктарскіх вучасткаў будзе абслугоўваць сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі. Намечана адкрыць рад новых вучасткаў спэцыяльна ў раёнах суцэльнай калектывізацыі. На пашырэньне сеткі вучасткаў адпушчана 320 тыс. руб.

400 БІБЛІЯТЭК У ВЁСКУ

Саюз сельгасрабочых Беларусі заключыў дагавор з рэдакцыйна - выдавецкім аддзелам ЦСПСБ аб укамплектаваньні 400 бібліятэк-стацыянарак для саўгасаў, лясьніцтваў і нізавых саюзных арганізацый. На куплю кніг адпускаецца 50-60 тыс. рублёў. Бібліятэкі будуць накіраваны ў раёны на працягу студзеня-лютага.

Пабудова трактара імя газ. „Віцебскі Пралетары"

ВІЦЕБСК (наш кар.). Разгортваецца збор сродкаў на трактар імя газэты «Віцебскі Пралетары». Сабрана ўжо некалькі соцень рублёў. Рабкораўскія гурткі спаборнічаюць у зборы сродкаў. Да 1-га мая трактар будзе перададзены камуне імя газэты «Віцебскі Пралетары» ў Гарадоцкім раёне.

Рабочыя--шэфы над савецкімі ўстановамі

БАБРУЙСК (наш кар.). Рабочыя-друкары ўзялі шэфства над акрфінаддзелам. Агульны сход рабочых пастанавіў выпучыць брыгаду ў 12 чалавек для дапамогі чыстцы апарату акрфа.

Вылучана таксама 20 чалавек, якія будуць правяраць і вывучаць работу акрфінаддзелу.

Рабочыя абавязаліся дапамагчы апарату акрфа ў спагнаньні нядоімак з прыватнікаў.

5 рабочых вылучана на адказную работу ў акрфа.

Буйныя саўгасы на балотных масывах Беларусі

На тэрыторыі БССР ёсьць каля 200 тыс. гэктараў мэліярацыйных фондаў на забалочаных землях.

СНК БССР пастанавіў вылучыць Зернятрэсту для арганізацыі саўгасаў наступныя плошчы: у вадазборы ракі Брагінкі каля 30 тыс. гэктараў, у вадазборы ракі Ведрычы — каля 50 тыс. гэктараў і ў вадазборы ракі Талькі — каля 10 тыс. гэктараў.

Самагубства настаўніцы-актывісткі

ГОМЕЛЬ (наш кар.). У вёсцы Старое Сяло, Веткаўскага раёну, пакончыла самагубствам настаўніца Палянская. Нябожчыца—энэргічная актыўная працаўніца, якая прымала ўдзел у грамадзкай рабоце і рашуча ўзялася за аздараўленьне Старасельскай школы.

Супроць яе пачаўся паход, цкаваньне і праследваньні. Загадчык школы Тамашоў, рад настаўнікаў, а таксама некаторыя мясцовыя працаўнікі дазволілі ў адносінах да яе антысэміцкія выпады.

Саюз сельгаслесрабочых лічыць, што лесазагатоўкі — не яго справа

(АД НАШАГА АРШАНСКАГА КАРЭСПАНДЭНТА)

Лесазагатоўкі на Аршаншчыне праводзяць Лесбел, МВБ чыг. і акрінспэктарыят лясоў. На лесараспрацоўках цяпер занята 5.667 чал. Арганізацыя арцелей вожчыкаў прахоліць зусім слаба. Пакуль што па дастаўцы лесу да чыгункі працуе ня больш 30 фурманак. Бываюць і такія факты, калі арганізаваныя з сялян арцелі вожчыкаў, не распачаўшы работы, зараз-жа і развальваюцца. Ня ўсе лесарубы маюць у належнай колькасьці інструманты і прадукты харчаваньня.

У Вагушэўскім раёне маюць месца і такія выпадкі, калі рабочыя пакідаюць баракі, спыняюць работу і прастойваюць у чарзе па хлеб і іншыя прадукты. Усё гэта здараецца толькі таму, што прараб Лесбелу гэтага вучастку бюракратычна адносіцца да работы і ня ставіць пытаньня канкрэтна, каб хлеб падвозілі да баракаў, дзе разьмешчаны рабочыя.

У Аршанскім вучастку Лесбелу былі дапушчаны і такія недарачнасьці: рабочыя арцелі прастойвалі цэлымі днямі і варочаліся дадому толькі таму, што ня было належных інструмантаў. Толькі ў апошні час лесазагатоўшчыкі пачалі забясьпечваць рабочых інструмантамі.

Вельмі не наладжана і сыстэма разьлікаў з рабочымі. Рабочыя па некалькі разоў за многа вёрст прыходзяць на лесазагатоўчыя вучасткі, каб атрымаць грошы.

У акруговым праўленьні саюзу сельгаслесрабочых нічога ня ведаюць, што робіцца на лесараспрацоўках. Саюз лічыць, што гэта не яго справа, бо ёсьць інспэкцыя працы, якая і павінна наглядаць за лесараспрацоўкамі. Саюз не правярае дагавораў, заключаных паміж лесарубамі і гаспадарнікамі, ён ня цікавіцца, у якіх умовах жывуць і працуюць лесарубы, як харчуюцца, як іх забясьпечваюць інструмантамі, як пастаўлена культурна-масавая работа сярод лесарубаў—пра ўсё гэта саюз зусім забыў. Сярод лесарубаў не праводзіцца сацыялістычнае спаборніцтва.

Вось у якіх умовах, прыходзіцца працаваць лесарубам на Аршаншчыне. Зразумела, што ўсё гэта можа адбіцца і на якасным і на колькасным выкананьні лесазагатоўчых плянаў. Інспэкцыя працы ў апошні час занялася пытаньнем і вядзе барацьбу з усімі адмоўнымі зьявішчамі, якія маюць месца на лесараспрацоўках, але без удзелу прафсаюзаў, без дапамогі грамадзкіх арганізацый яна адна наўрад ці што зробіць. Аршанскаму саюзу сельгасрабочых трэба падцягнуцца.

А. М.

Сялянства Мазыршчыны яшчэ ня прыцягнута да лесазагатовак

Мерапрыемствы Мазырскага АВК па павялічэньні тэмпу лесазагатовак ужо даюць добрыя вынікі. За апошні тыдзень лесазагатоўкі значна пашырыліся, хоць пытаньне выкананьня пляну ўсё яшчэ стаіць вельмі востра. Галоўным недахопам у справе лесазагатовак трэба лічыць слабую працу на мясцох. Пакуль што аб важнасьці выкананьня пляну лесазагатовак гавораць толькі на нарадах і пасяджэньнях тых ці іншых устаноў, а сялянства і арганізаваная маса лесарубаў зусім ня ўцягнуты ў абгаварэньне гэтых пытаньняў. Нават сельсаветы часта нядбайна адносяцца да гэтае вельмі важнае работы. Яны нічога ня робяць па ўцягненьні рабочых у заготоўкі лесу. Ёсьць паасобныя вёскі на Мазыршчыне, дзе ніхто а бяднейшага сялянства не запрошаны на работу па загатоўках лесу. Наадварот, некаторыя старшыні сельсаветаў адгаворваюць рабочых і беднату ісьці на лесазагатоўкі. Гэтыя сельсаветчыкі заяўляюць, што ня варта працаваць наводле расэнак, зацьверджаных АВК.

Трэба ўсю працу па ўзмацненьні тэмпу лесазагатовак перанесьці ў сялянскія масы. У кожнай вёсцы на агульных сходах павінна быць растлумачана бядняцка-серадняцкім пластом вёскі важнасьць іх удзелу ў лесазагатоўчай кампаніі.

МАЗЫРЧАНІН.

2-гі ДЗЕНЬ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ Ў БССР

прайшоў пад знакам падтрыманьня пяцігодкі шырокімі рабочымі масамі

ЛІК ПРАГУЛАЎ ПА ПРАДПРЫЕМСТВАХ БЫЎ МЕНШЫМ, ЧЫМ У ЗВЫЧАЙНЫЯ ДНІ

100 тысяч руб. дасьць 2-гі дзень індустрыялізацыі

Паводле даных ВСНГБ, другі дзень індустрыялізацыі па прадпрыемствах дзяржаўнай прамысловасьці БССР дасьць каля 85 тыс. руб. Акрамя таго, каля 15.000 руб. дадуць прадпрыемствы, якія працуюць бесьперапынна. Там, паводле пастаноў рабочых сходаў, рабочыя адпрацуюць гэты дзень у адзін з выхадных дзён.

Сьвята калектыўнай працы

У дзень „каляд" усе рабочыя менскіх прадпрыемстваў вышлі на работу

Дзень каляд рабочыя менскіх прадпрыемстваў абярнулі ў вялікі рух за індустрыялізацыю краіны. 25 сьнежня быў днём сьвята калектыўнай працы. Рабочыя давялі сваю клясавую сьвядомасьць і глыбокае разуменьне задач, якія стаяць у сучасны рэканструкцыйны пэрыяд.

Весткі аб тым, як прайшоў другі дзень індустрыялізацыі па фабрыках і заводах, паказваюць, што рабочыя аднадушна адмовіліся ад рэлігійнага, п'янага сьвята і працавалі ў гэты дзень на карысьць індустрыялізацыі краіны.

Звычайны лік прагулаў на заводах і фабрыках значна паменшыўся ў дзень каляд, а на некаторых прадпрыемствах прагулаў зусім ня было. На заводзе «Беларусь» ня выйшаў на работу адзін рабочы, на заводзе «Энэргія» — два рабочыя. На заводзе «Камунар», на гуце «Пралетары», на дражджавым заводзе «Чырвоная Зара» ня было ні аднаго прагулу.

Рабочыя і служачыя «Эльводу», ня гледзячы на тое, што яны даўно перайшлі ўжо на бесьперапынку, пастанавілі адпрацаваць кожнаму свой выхадны дзень у фонд індустрыялізацыі краіны.

Учарашны дзень упёс вялікую суму ў фонд індустрыялізацыі краіны. Рабочыя заводу «Энэргія» далі ўчора ў фонд індустрыялізацыі каля 3 тысяч рублёў, рабочыя заводу «Камунар» — 2.700 руб., завод «Бальшавік» — 2.500 руб., завод «Чырвоная Зара»— 450 руб., гута «Пралетары» — каля 1.000 руб., завод «Беларусь» — 216 рублёў і г. д.

Учарашны дзень быў ня толькі вялікім укладам у індустрыялізацыю краіны, гэта быў моцны ўдар па рэлігіі, па папох, ксяндзох, сэктантах і інш.

Агульны сход працаўнікоў Белдзяржгандлю заслухаў даклад аб анты-калядной кампаніі. Сход пастанавіў абвясьціць дзень 25-га сьнежня другім днём індустрыялізацыі; прасіць гарсавет перадаць усе званы на патрэбы індустрыялізацыі краіны, паскорыць перадачу памяшканьняў цэркваў і сынагог пад культурна-асьветныя ўстановы.

***

Агульны сход членаў саюзу і саматужнікаў-яўрэяў мястэчка Пухавічы пастанавіў прасіць РВК закрыць яўрэйскую сынагогу, памяшканьне перадаць пад яўрэйскую сямігодку.

Жыхары бліжэйшых вёсак пастанавілі—перадаць памяшканьне царквы пад нардом, а званы перадаць у фонд індустрыялізацыі краіны на пабудову трактарнай калёны.

Справа аб забойстве т. Варавы

Твар клясавага ворага

23-га сьнежня на працэсе аб забойстве рэдактара насьпецгазэты тав. Варавы працягваўся допыт забойцы Насуты.

Цікава, як адносіўся Насута да маладых спэцыялістых?

На запытаньне суду, ці перадаваў ён ім свае веды, Насута катэгарычна адказвае: **не.**

Па яго думцы, яны ня мелі на гэта «права». Але тут-жа Насута прымушаны прызнаць, што ў часе сваёй вучобы ён гэтым правам карыстаўся.

Допыт Насуты закончан. Суд пераходзіць да допыту наступнага абвінавачанага Парсакова. Допыт заняў канец вячэрняга пасяджэньня 24 сьнежня і вячэрняе пасяджэньне 25-га сьнежня.

На запытаньне суду, ці прызнае ён сябе вінаватым у тым, што падгаварыў Насуту на забойства, Парсакоў дае адмоўны адказ. Суд імкнецца выявіць узаемаадносіны, якія існавалі паміж Парсакоўым і забітым Варавай. Але абвінавачаны ўхіляецца ад адказу на запытаньні суду.

Абвінавачаньне вельмі цікавіцца сацыяльнай фізіяноміяй падсуднага. Ён выхоўваўся ў сям'і бацькі, які 20 год верай і праўдай служыў царызму па пасадзе паліцэйскага вурадніка. Але гэта не перашкаджае сыну зараз... «спачуваць». У Пабіянцах бадай усе фабрыкі... [illegible] фірмы прымушаны былі спыніць нінцу, абяцаньне, што э напружанасьцю... [illegible]

— Калі допытваецца, што Насута быў нармальным чалавекам — трэба прызнаць, што забойства было палітычным актам.

Парсакоў наогул імкнецца навязаць суду вэрсію аб ненармальнасьці забойцы.

Падсудны Парсакоў прызнае, што Насута гаварыў яму аб тым, што ён мае намер забіць Вараву, Трапашку і Дробыжава, якія быццам цкуюць яго (Насуту), але ён ніякай зброі Насуце не прапаноўваў.

Тут-жа Насута пацьвярджае, што Парсакоў прапаноўваў яму рэвальвэр, каб... расправіцца з ворагамі.

Суд пераходзіць да допыту самага маладога з падсудных—Вэнэдыктава.

Вэнэдыктаў ведаў, што Насута зьбіраецца забіць Вараву, ведаў, але маўчаў, не паведаміў, каму належыць, бо ня ведаў, ці выканае Насута свой намер».

На папярэднім следзтве Вэнэдыктаў заявіў, што Насута адночы сказаў яму: «Цяпер усякі дурань можа быць начальствам, калі ён камуністы». Зараз ён адмаўляецца ад ранейшага паказаньня. Следчы навязаў яму гэта.

Допыт падсудных скончаны.

Сёньня допыт сьведак.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЕСНАВОЕ СЯЎБЫ

Забясьпечым палі насеньнем і ўгнаеньнем

РАЗГОРНЕМ ЗАГАТОЎКІ НАСЕНЬНЯ У МЕЖАХ БССР. СТВОРЫМ НАСЕННЫЯ ФОНДЫ У КАЛГАСАХ І САЎГАСАХ

Ці забясьпечана пасеўная кампанія ў БССР сродкамі вытворчасьці? Гэтае пытаньне вырашала нарада, якая адбылася гэтымі днямі пры кіраўніцтве сельскае гаспадаркі НКЗ БССР.

Пасьля абмену думкамі прадстаўнікі зацікаўленых арганізацый прышлі да адзінага выраду, што становішча **з завозам насеньня далёка нездавальняючае.** БССР будзе забясьпечана насеньнем культурных траў ня больш, чым па 50 процантаў. Трэба зноў узьняць хадайніцтва перад адпаведнымі саюзнымі органамі аб павялічэньні завозу. Як радыкальныя меры, нарада лічыць — узмацненьне загатовак насеньня ў межах самой БССР. Між тым, па гэту справу ў нас усё яшчэ зварачаецца вельмі мала ўвагі. Паводле вестак спажывецкая і с.-г. каапэрацыйныя сыстэмы да гэтага часу загатовілі ўсяго некалькі дзесяткаў тон лубіну і канюшыны. **Між тым, яны павінны загатовіць 4.354 тоны лубіну, 540 тон канюшыны і 2.800 тон вікі.** Цікава, што заданьне па загатоўцы канюшыны і лубіну меншае, чым закантрактаваная колькасьць гэтых культур. Нават гэты адзін факт ужо сьведчыць аб тым, **што размер загатовак насеньня культурных траў у БССР вызначаны меншы, чым можна загатовіць.**

У сувязі з тым, што з іншых раёнаў СССР і заграніцы мы атрымаем далёка невыстарчальную колькасьць насеньня, трэба ставіць пытаньне **аб павялічэньні размеру загатовак насеньня ў самой БССР.** Акрамя таго трэба ў адносінах загатоўкі насеньня культурных траў ужыць такі-ж мэтад, як і пры загатоўцы хлеба, г. зн. давесьці плян да вёскі і да асобнага заможнага двара. На загатоўку насеньня ў БССР павінна быць зьвернута максымальная ўвага.

Як пакрыць дэфіцыт мінэральных угнаеньняў. Па гэтае пытаньне нарада аднадушна адказала: неабходна ўсялякімі мерамі ўзмаціць скарыстаньне мясцовых рэсурсаў: торфу, попелу і розных адкідаў. Нарада канстатавала, што да гэтага часу ягшчэ канкрэтна нічога ня робіцца ў галіне скарыстаньня мясцовых рэсурсаў. Што датычыць арганізацыі збору попелу, дык грамадзкасьць яшчэ не разварушылася, мала зварачаюць увагі на гэту справу жакты і нават прадпрыемствы. Пастаноўлена ўсклясьці арганізацыю збору попелу і адкідаў на якую-небудзь пэўную ўстанову, якая павінна адказваць за гэтую справу.

ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ ДАПАМАГАЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ВЕСКІ

Чырвоаармейцы і кампалітсклад №-скага стрэлковага палка, жадаючы практычна дапамагчы калектывізацыі вёскі, парашылі арганізаваць у палку трактарныя майстэрні. У гэтых майстэрнях будуць падрыхтоўвацца трактарыстыя і шофэры з батракоў і беднякоў чырвоаармейцаў.

Праграмам будзе складацца з 120 гадзін практычных заняткаў і 80 гадзін—тэарытычных у зімовы пэрыяд. Улетку будзе праводзіцца выключна практычная язда на трактарах і аўтамабілях.

Ужо ў 1929-30 годзе мяркуецца выпусьціць 100-150 чал. трактарыстых.

У пятніцу, 27-га сьнежня, а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні рэдакцыі газэты «Зьвязда»

— СКЛІКАЕЦЦА —

Гарадзкая Нарада рабкораў газ. „Зьвязда"

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Вынікі «налёта» брыгады на рабочыя сталоўкі.
2. Аб стварэньні ўдарнай рабкоратскай брыгады пры «Зьвяздзе».

Просьба да ўсіх рабкораў газэты «Зьвязда» зьявіцца без опазьненьня.

На нараду запрашаюцца ўсе рабочыя і дактары, якія ўдзельнічалі ў налёце на сталоўкі рэйоны насьцен-газэт, а таксама загадчыкі отделаў і прадпрыемствы, «Дрэвапрацоўшчык», «Энэргія», «Бальшавік» і сталовая ЦРК № № 1, 3, 8.

СЭКТАР МАСАВАЙ РАБОТЫ газ. «ЗЬВЯЗДА».

ФРУНЗАЎСКІ РАЙКОМ КП(б)Б

СКЛІКАЕ сёньня а 6 гадз. увеч. **НАРАДУ**

ЯЧЭЙКАВЫХ УПОЎНАВАЖАНЫХ „ЗЬВЯЗДЫ"

па пытаньні спаборніцтва па падпісцы на „ЗЬВЯЗДУ" ў раёне і ячэйках і інш.

Упоўнаважаныя ад партыйных і іншых сходаў вызваляюцца.

Нарада адбудзецца ў памяшканьні АПА раёну.

30.000 падпісчыкаў на „ЗЬВЯЗДУ“ павінна быць к 1-му студзеня 1930 г.

У прэзыдыуме ЦСПСБ

Прафработнікі, выпісвайце „Зьвязду“

Прэзыдыум ЦСПСБ назначыў адказнымі рэдактарамі газэты «Прафрух»— дадатку да газэты «Зьвязда»—т. т. Асьмова і Клімковіча.

Прэзыдыум ЦСПСБ прапанаваў усім ЦП саюзаў, акруговым прафбюро і ўсім пізавым прафчэйкам узмацніць кампанію за падпіску на «Зьвязду», растлумачыўшы прафактыву і шырокім рабочым масам значэньне «Зьвязды», як цэнтральнага органу партыі і кіруючай партыйна-прафсаюзнай газэты (са спэцыяльным дадаткам «Прафрух») у справе ўзмацненьня прафсаюзнай і палітыка-выхаваўчай работы сярод прафсаюзных мас.

Канфэрэнцыя рабочых палякаў

18-га студзеня склікаецца Менская акруговая канфэрэнцыя рабочых-палякаў з парадкам дня: 1) даклад аб міжнародным становішчы СССР, 2) аб эканамічным і палітычным становішчы фашысцкай Польшчы, 3) аб працы прафсаюзаў сярод рабочых-палякаў. Модус прадстаўніцтва—1:20. Там, дзе ёсьць 15 рабочых-палякаў, таксама выбіраецца адзін дэлегат. На канфэрэнцыю чакаецца звыш 50-ці дэлегатаў.

15-га студзеня адкрываецца школа прафруху

Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў адкрыць 15-га студзеня рэспубліканскую школу прафруху ў Беларусі пры ЦСПСБ. На курсы будзе прынята 50 чал., з іх 30 дадуць акругі, рэшту—Менск. У лік 50 курсантаў будуць прыняты 18 жанчын, а таксама 10 чал. моладзі. Як правіла, курсанты павінны мець 2-хгадовы стаж кіруючай пізавой прафработы і 3-хгадовы стаж работы на вытворчасьці.

Дыфэрэнцыяваны пай у Жактах

Для ўзмацненьня фінансавай базы Жактаў, што вельмі неабходна, для далейшага пасьняховага захаваньня жыльлёвага фонду, прэзыдыум ЦСПСБ зацьвердзіў разьмер новага дыфэрэнцыяванага паю ў Жактах і парадак яго спагнаньня. На працягу бліжэйшых 4-х год, пачынаючы з 1-га студзеня 1930 г., пай ў Жактах будуць павялічаны да 60 руб. у сярэднім, прычым пай ў паасобку, у залежнасьці ад разьмеру акладу пэнсіі, будуць складаць ад 10 да 126 руб. (для асоб з пэнсіяй звыш 200 руб.). Табліцы дыфэрэнцыяванага паю будуць разасланы па Жактах

Увага зьлётам „лёгкай кавалерыі“

Надаючы важнае палітычнае значэньне склікаемым раённым і ўсебеларускаму зьлётам «лёгкай кавалерыі», прэзыдыум ЦСПСБ прапанаваў усім прафарганізацыям прыцягнуць шырокія масы працоўных да ўдзелу ў агляднае дзейнасьці «лёгкай кавалерыі» і камсамолу ў цэлым на фронце барацьбы з бюракратызмам на розных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва (сацспаборніцтва, калектывізацыя, чыстка савецкага апарату і г. д.), выдучаючы для гэтага рабочыя брыгады і асьвятляючы гэта пытаньне ў друкаваных і насьцепных газэтах прадпрыемстваў.

Вакол зьлётаў «лёгкай кавалерыі» трэба стварыць грамадзкую думку пад лёзунгамі ўцягненьня шырокіх мас рабочай моладзі і дарослых рабочых у атрады «лёгкай кавалерыі».

На ўсебеларускі зьлёт запрашаюцца з найбольш буйных прадпрыемстваў 15 рабочых. Дэлегаты ўсебеларускага зьлёту будуць разьмешчаны па кватэрах рабочай моладзі і камсамольцаў.

Прэзыдыум ЦСПСБ адзначыў, што асаблівую ўвагу зьлётам «лёгкай кавалерыі» павінен удзяліць саюз саўгандальслужачых і скарыстаць іх для арганізацыі самаправеркі саюзу ў барацьбе з бюракратызмам і ўдзелу ў чыстцы савецкага апарату.

Агляд ячэек МОПР'у значна дапамагае ў правядзеньні зімовай кампаніі дапамогі

У Барысаве праца ячэек МОПР'у знаходзіцца ў недапушчальным стане

Як ідзе агляд ячэек МОПР'у

(Менская акруга)

Першыя вынікі кампаніі агляду ячэек Мопру па Менскай акрузе паказалі, наколькі гэта кампанія сваячасова праводзіцца.

Менакругком Мопру правёў значную падрыхтоўчую работу да агляду ячэек. Два разы на агульна - гарадзкіх нарадах актыву і на нарадах ячэек асобных груп абгаворвалася пытаньне і плян правядзеньня агляду.

Шмат увагі аддаюць кампаніі агляду ячэек Мопру амаль усе цэнтральныя газэты, асабліва «Зьвязда», дзякуючы чаму згуртавана вялікая грамадзкая думка вакол гэтай кампаніі.

Па гор. Менску ўжо праведзен агляд 63-х ячэек (вытворчыя, савецкія, вайсковыя і вучнёўскія) сіламі актыву АК і гарадзкіх райкомаў Мопру, а таксама ўцягнута ў гэту работу каля 25-ці чалавек «лёгкай кавалерыі». Гарадзкія ячэйкі Мопру, у якіх праведзен агляд, зразумелі важнасьць гэтай кампаніі і адчулі большую адказнасьць за сваю работу.

Да самых галоўнейшых недахопаў у рабоце гарадзкіх ячэек трэба аднесьці адсутнасьць грамадзкасьці ў большасьці бюро ячэек з боку нізавога актыву і безадказнасьць да сваіх абавязкаў. Недапушчальныя адносіны да пастаноўкі інтэрнацыянальна - выхаваўчай работы і распаўсюджаньня часопісі «Путь Мопра».

Але разам з гэтым, канстатавана амаль што ва ўсіх ячэйках вялікая актыўнасьць і сьвядомасьць рабочых і служачых да Мопраўскіх кампаній па зборы сродкаў. Матар'яльная дапамога палітзьняволеным сустракае самае брацкае і гарачае спачуваньне з боку працоўных.

Усе ячэйкі выканалі з вялікім перавышэньнем заданьні райкомаў па зборы сродкаў. Расьце і мацнее аўтарытэт мопраўскіх ячэек у вачох рабочых мас, дзякуючы актыўнаму ўдзелу амаль што ўсіх ячэек у сацыялістычным будаўніцтве, асабліва па рэалізацыі 2-й і 3-й пазыкі індустрыялізацыі на карысьць палітзьняволеных.

Выязныя ўдарныя мопраўскія брыгады, якія выяжджалі ў Барысаў—11 чал., у Пухавіцкі раён — 3 чал., і ў Заслаўскі — 2 чал., узварушылі гэтыя арганізацыі, узьнялі працаздольнасьць ячэек і райкомаў. Дапамаглі райкомам пасьняхова падштурхнуць правядзеньне кампаніі зімовай дапамогі і выклікалі зацікаўленасьць сялян да Мопру.

Праведзенае ўсебаковае абсьледваньне работы ў Лагойскай арганізацыі Мопру і роспуск бязьдзейнага Астрашыцка-Гарадзецкага РК інструктарам акругкому таксама далі свае належныя вынікі.

У Барысаве брыгада канстатавала недапушчальна агіднае становішча арганізацыі Мопру. На такіх буйнейшых заводах і фабрыках, як «Чырвоная Бярэзіна» з 1.200 рабочымі, усяго ёсьць членаў Мопру 200 чалавек; на гуце імя Домбаля з 1.030 рабочымі — 85 членаў Мопру. З боку прафарганізацый канстатаваны выпадкі ігнараваньня і перашкоды ў рабоце ячэек Мопру. Безадказная заява ў прысутнасьці рабочых сакратара парт'ячэйкі заводу «Рабочий» аб тым, што не абавязкова быць яму членам Мопру, і тое, што старшыня ФЗК гуты імя Домбаля толькі ў часе агляду запісаўся ў члены Мопру, яшчэ больш сьведчаць аб нуважлівым кіраўніцтве і дапамозе з боку парт'ячэек і прафсаюзных арганізацый у рабоце Мопраўскіх ячэек.

Кампанія агляду яшчэ не закончана. Яна яшчэ працягнецца каля месяца. За гэты час Мен. АК Мопру мяркуе асабліва зьвярнуць увагу на масавую вярбоўку сялян у Мопр, для чаго і будзе праводзіцца «месячнік вярбоўкі сялян у Мопр».

Трэба спадзявацца, што ўсе тыя задачы, якія сталі пры правядзеньні агляду генэральнай праверкі работы ячэек Мопру, будуць вырашаны ў сэнсе ўзмацненьня працаздольнасьці бюро ячэек, перабудовы ўсёй мопраўскай работы на рэйках інтэрнацыянальнага выхаваньня і павялічаць значна рады Мопру

ЦУДЗІН.

Агляд ячэек МОПР'у ў Гомелі

Агляд ячэек МОПР'у ахапіў толькі гарадзкія ячэйкі, вясковыя арганізацыі па цэлым радзе прычын (хлебазагатоўкі і г. д.) гэту работу яшчэ не разгарнулі. З 29 гарадзкіх ячэек пакуль што праверана 19. Праверачныя матар'ялы абмяркоўваліся на пашыраных пасяджэньнях бюро з актывам і на агульных сходах ячэек МОПР'у. Брыгадзіры таксама склікаліся ў АК для падагуленьня вынікаў.

У часе агляду выявілася значная слабасьць пастаноўкі выхаваўчай работы ў ячэйках. Агітработа не заўсёды ўвязваецца з надзённымі пытаньнямі жыцьця і будаўніцтвам СССР. Слабая ўвага зварачаецца на працу ячэек МОПР'у з боку прафсаюзных арганізацый, камсамолу і некаторых партыйных ячэек, але выяўлены таксама і рад дадатных момантаў: рост арганізацыі за лік новых колаў рабочых, пэрыядычная чытка мопр літаратуры, удзел ячэек у сацыялістычным будаўніцтве (загатоўка мяшкоў, антырэлігійная прапаганда, удзел у сацспаборніцтве), павялічэньне паступленьня сродкаў, распаўсюджаньне літаратуры і часопісяй.

Некаторыя ячэйкі разгарнулі паміж сабой спаборніцтва на лепшую пастаноўку мопраўскай работы, правядзяць самаправерку сваёй работы, што дасьць магчымасьць хутчэй выправіць памылкі і палепшыць нашу работу.

Агляд сябе апраўдвае, трэба толькі, каб ячэйкі як у горадзе, так і ў вёсцы, якія яшчэ не пачалі гэту работу, хутчэй узяліся за яе правядзеньне.

ПЛОТКІН.

Пятрыкоўцы ідуць у першых радох

(Мазырская акруга)

Па кантрольных лічбах Мазырскага АК МОПР'у па кампаніі зімовай дапамогі мы павінны былі сабраць — 400 рублёў. На сёньняшні дзень адзін толькі горад і адна ячэйка выканалі заданьне на 145%, або сабралі 561 руб. 81 кап., у тым ліку ячэйка МОПР'у шавецкай арцелі «Аб'яднаньне» дала 193 руб. 26 кап.

І надалей пятрыкоўцы абяцаюць заўсёды памятаць аб замежных братох — барацьбітох пралетарскай рэвалюцыі.

***

Пятрыкоўскі райком МОПР'у арганізаваў у дзень 12-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі скарбоначны збор па горадзе ў карысьць палітзьняволеных падшэфнай турмы. Насельніцтва вельмі чула адгукнулася на заклік АК МОПР'у аб дапамозе палітзьняволеным, у выніку чаго сабрана 501 руб.

Гэтыя грошы на ўрачыстым пасяджэньні грамадзян гораду будуць адасланы ЦК МОПР'у для перадачы таварышом з падшэфнай турмы.

ГАРБАР-ПАЛЕСКІ.

Бярэзне прыклад

(Ячэйка МОПР'у ЖАКТ'у № 3)

Наша ячэйка падышла вельмі сур'ёзна да кампаніі зімовай дапамогі. Мы разьмеркавалі паміж актывістымі падпісныя лісты і праз некалькі дзён яны выканалі заданьне Фрунзаўскага РК МОПР'у на 165 проц., што сьведчыць аб актыўнасьці нашых мопраўцаў, якія выканалі свой грамадзянскі абавязак перад замежнымі таварышамі.

Ячэйка МОПР'у ЖАКТ'у № 3 выклікае ўсе жактаўскія ячэйкі выканаць заданьне РК МОПР'у на ўсе 100 проц.

Д.

Чырвонаармейцы не адстаюць

(МЕНСК)

Да агляду ячэек МОПР'у і кампаніі зімовай дапамогі ў нашым №-скім палку разгарнулі працу сярод маладзяка ў карантынах. Па кампаніі зімовай дапамогі сабрана больш за 20 руб. Мы разгарнулі работу па вярбоўку новых членаў з ліку маладых чырвонаармейцаў 1907 году больш, як 200 чал. Адначасова разгарнулі спаборніцтва паміж карантынамі на большую вярбоўку чырвонаармейцаў у члены МОПР'у і на большыя зборы грошай на карысьць палітзьняволеных, што дало добрыя вынікі

МОПРАВЕЦ—К.

Вечар сустрэчы рабочых-друкароў з вылучэнцамі

Па саюзе друкароў за апошні час вылучана на кіруючую работу ў савецкіх установах больш за 50 чалавек.

23-га сьнежня ЦП саюзу друкароў арганізавала вечар сустрэчы вылучэнцаў з рабочымі-друкарамі. Вялікая заля клюбу друкароў была перапоўнена. Ва ўступнай прамове сакратар партыйнага калектыву 1-й друкарні тав. Каждан ахарактарызаваў значэньне арабочаньня савецкага апарату. Адзін за другім выступалі вылучэнцы, якія характарызавалі абстаноўку работы вылучэнцаў ва ўстановах.

Тав. Астроўскі—рабочы першай друкарні, зараз член калегіі вярхоўнага суду—адзначыў, што яму адразу было вельмі цяжка працаваць, ня ведаў за што ўзяцца, але яму дапамаглі, паслалі вучыцца ва унівэрсытэт, на юрыдычныя курсы, зараз ён спраўляецца з работай.

Тав. Дарафеева—работніца першай друкарні, зараз загадчыца 4-й сталоўкі МЦРК—адзначыла тыя труднасьці, якія прышлося сустрэць пры азнаямленьні з новай зусім невядомай работай.

Рабочы Бэрнштэйн—намесьнік акруговага інспэктара працы—паведаміў пра выпадак, калі пры абсьледваньні заводу «Пралетары» з ім адмовіліся гаварыць і выгналі з заводу.

Тав. Нячаеў—рабочы першай друкарні, зараз намесьнік загадчыка камгасу—падкрэсьліў, што апарат камунальнай гаспадаркі, у зьвязку з вялікімі задачамі, ускладенымі на яго, патрабуе далейшага арабочаньня, гэта-ж адзначыў рабочы працкалектыву Рубін, які займае пасаду загадчыка жылсталом камгасу.

Вылучэнцы аднадушна заявілі, што адносіны да рабочых, вылучаных у апарат, зараз палепшыліся. што вылучэнцы з работай спраўляюцца.

Вылучэнцы павінны рабіць справаздачы на пасяджэньнях фабзаўкомаў, на агульных сходах рабочых.

У рэзалюцыі ўдзельнікі вечару выклікалі на спаборніцтва ўсе прафарганізацыі гораду на правядзеньне вечароў сустрэч вылучэнцаў з рабочымі.

П. НОВІКАЎ.

Што новага ў эфіры

Праграма перадач Менскай радыёстанцыі

ЧАЦЬВЕР 26-га СЬНЕЖНЯ

17—00 Час акцябрат.
17—30 Час студэнта.
18—00 Рабоча-Сялянскі унівэрсытэт па радыё.
19—00 Беларуская радыё-газэта.
20—00 Праверка часу.
20—00 Праца грамадзкіх арганізацый.
20—30 Час мацеры і гаспадыні.
21—00 На фронце сацыялістычнага будаўніцтва.
21—30 Трансьляцыя.

ПЯТНІЦА 27-га СЬНЕЖНЯ

17—00 Час піянэра і вучня.
17—40 Сялянскі час.
18—00 Рабоча-сялянскі унівэрсытэт па радыё.
19—00 Беларуская радыё-газэта (з лат. адда.).
20—00 Праверка часу.
20—00 Гадзіна прафработніка.
20—25 Перадача на мове эсэранта: антырэлігійная радыё-газэта.
20—40 Інфармацыя ўраду.
21—00 Канцэрт «Песьні і танцы народаў».
23—00 Азбука «Морзэ».

СУБОТА 28-га СЬНЕЖНЯ

17—00 Пасьлязабедзёны канцэрт.
17—30 Гадзіна абароны краіны і Чырвонай арміі: служба «ВНОС» (Віншеўскі).
18—00 Рабоча - сялянскі унівэрсытэт па радыё.
19—00 Беларуская радыё-газэта (з яўрэйск. адда.).
20—00 Праверка часу.
20—00 Сялянская вячорка
21—00 Канцэрт рабочых гурткоў.

НЯДЗЕЛЯ 29-га СЬНЕЖНЯ

9—00 Шахматы і шашкі па радыё.
9—30 Сялянскі бязбожнік-ранішнік.
10—40 Палітычны і эканамічны агляд за тыдзень.
11—20 Сьпявайце разам з намі.
12—00 Агляд сёньняшніх цэнтральных і мясцовых газэт.
17—00 Літаратурны тыдзень
18—00 Рабоча - сялянскі унівэрсытэт па радыё.
19—00 Гадзіна актывісткі, работніцы і сялянкі.
19—40 «Чырвоная зьмена» па радыё.
20—30 Канцэрт.
23—00 Розныя інфармацыі.

Х-годзьдзе дэкрэту аб ліквідацыі няпісьменнасьці

Ні адна дзяржава сьвету не магла і ня можа так шырока паставіць пытаньне барацьбы за ўсеагульную пісьменнасьць, як гэта зрабіла савецкая ўлада.

Гістарычны дэкрэт

У цяжкія гады грамадзянскай вайны, у абставінах агульнай разрухі, голаду і холаду, 26 сьнежня 1929 г. быў падпісаны У. І. Леніным гістарычны дэкрэт аб ліквідацыі няпісьменнасьці «ў мэтах прадастаўленьня ўсяму насельніцтву рэспублікі магчымасьці сьвядомага ўдзелу ў палітычным жыцьці краіны»...

Паводле дэкрэту «ўсё насельніцтва рэспублікі ва ўзросьце ад 8 да 50 год, што ня ўмее чытаць і пісаць, абавязана навучыцца грамаце на роднай або на расійскай мове, па жаданьні. Навучаньне гэтае вядзецца ў дзяржаўных школах як існуючых, так і ўстанаўляемых для няпісьменнага насельніцтва па плянах НКАсьветы».

«Наркамасьветы і яго мясцовым органам даецца права прыцягваць да навучаньня няпісьменных у парадку працоўнай павіннасьці ўсё пісьменнае насельніцтва краіны, што ня прызвана ў войска, і аплата іх працы па нормах працаўнікоў асьветы».

Наступныя шэсьць пунктаў дэкрэту даюць устаноўку ў рабоце па ліквідацыі няпісьменнасьці і закранаюць цэлую сыстэму арганізаваных мерапрыемстваў па пастаноўцы і наладжаньні справы ліквідацыі няпісьменнасьці.

Фактам выданьня гэтага дэкрэту была практычна пастаўленая задача зламаць спадчыну мінулага — далучыць шматмільённыя масы працоўных да актыўнага ўдзелу ў нашым жыцьці. Апараты, створаныя для ліквідацыі няпісьменнасьці, былі ўзмоцнены, а праз год была арганізавана цэнтральная наздвычайная камісія па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Дэкрэтам была створана належная грамадзкая думка вакол пытаньня ліквідацыі няпісьменнасьці. У гэтую справу былі ўцягнуты прафсаюзныя, камсамольскія і інш. арганізацыі. З 1923 году ўтварэецца т-ва «Прэч няпісьменнасьць».

Сэнс Ленінскага дэкрэту ня страціў сваёй вострасьці і да сёньняшняга часу, бо ў нас на СССР яшчэ каля 30 мільёнаў няпісьменных; у БССР процант няпісьменнага насельніцтва дасягае 47-49. Такі высокі процант няпісьменных шкодзіць нам з посьпехам выконваць пяцігодку, шкодзіць наступаць на кулака, шкодзіць з посьпехам разгортваць буйную калектыўную гаспадарку, сацыялістычную рэканструкцыю прамысловасьці, затрымлівае разгортваньне самакрытыкі і барацьбу з бюракратызмам.

Таму мы павінны ўзмацніць тэмп і якасьць работы па ліквідацыі няпісьменнасьці, пранізаць усю гэту работу палітычным, а гэта значыць і клясавым зьместам, уцягнуць у барацьбу за грамату на палставах шырокага грамадзкага спаборніцтва ўсіх працоўных.

«Мы павінны ўзяцца за простую істотную справу мабілізацыі пісьменных на барацьбу з няпісьменнасьцю». Гэтыя словы У. І. Леніна павінны стаць праграмай нашай штодзённай работы і ў першую чаргу т-ва «Прэч няпісьменнасьць» і кожнага члена яго паасобку.

Трэба ў адпаведнасьці з пастановамі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб ліквідацыі няпісьменнасьці ўсю работу т-ва «Прэч няпісьменнасьць» зьверху да нізу прасякнуць элемэнтамі сацыялістычнага спаборніцтва, зрабіць больш гібкай, а само т-ва—масавым і працаздольным.

Дзесяцігодзьдзе Ленінскага дэкрэту аб ліквідацыі няпісьменнасьці нам трэба правесьці пад знакам масавай праверкі становішча ліквідацыі няпісьменнасьці па акругах, прадпрыемствах, калгасах, удзелу т-ва «П. Н.» у гэтай рабоце, уцягненьня ў культпаход новых таварышоў.

МУХІН.

Ліквідацыя няпісьменнасьці ў БССР

У Беларусі, з прычыны акупацыі яе белапалякамі, работа па ліквідацыі няпісьменнасьці была пачата са спазьненьнем — у канцы 1920 году.

Ня гледзячы на тое, што з 1920 году на 1926 год лік пісьменнага насельніцтва павялічыўся на 26 проц., усё-ж, паводле перапісу 1926 году, з 4 мільёнаў 983 тысяч насельніцтва, пісьменных налічваецца 2 мільёны 26 тысяч, што складае 40,7 проц.

Трэба адзначыць, што тэмп ліквідацыі няпісьменнасьці з кожным годам узрастае. Так, калі ў 1923-24 г. скончыла лікпункты ўсяго 744 чал., у 1924-1925 годзе — 39.046 чал., у 1928-29 г.— 68.883 чал., дык у бягучым годзе намечана ліквідаваць няпісьменнасьць 280 тысяч 490 чал.

Павялічваюцца таксама кожны год і сродкі, якія адпускаюцца на ліквідацыю няпісьменнасьці. У 1927-28 годзе адпушчана на ліквідацыю 205.762 руб., у 1928-29 годзе — 316 354, а ў 1929-30 годзе намечана выдаткаваць 1.081.000 рублёў. Але, трэба адзначыць, бываюць факты, калі РВК скарыстоўвалі фонды, адпушчаныя на ліквідацыю няпісьменнасьці, зусім на іншыя мэты.

З падручнікамі для лікпунктаў справа абстаяла да гэтага часу вельмі кепска. Так, па 15-е лістапада толькі 60 проц. усіх лікпунктаў былі забясьпечаны падручнікамі, якія былі выпушчаны з вялікім спазьненьнем. Зараз на дапамогу лікпунктам выпускаецца спэцыяльная бібліятэчка для малапісьменных і рыхтуецца да выданьня спэцыяльная насьцепгазэта - дзесяціднёўка для навучаньня малапісьменных і няпісьменных.

У гэтым годзе, згодна пляну, намечана поўнасьцю ліквідаваць няпісьменнасьць сярод рабочых, грамадзкіх працаўнікоў вёскі і падросткаў узростам 12-15 год. Акрамя гэтага, намечана ахапіць да 60 проц. усіх няпісьменных батракоў і калгаснікаў.

Вялікай перашкодай у справе ліквідацыі няпісьменнасьці аьяўляецца адсутнасьць памяшканьняў для лікпунктаў. Ня гледячы на тое, што ўсе школы, клюбы, нардамы і часткова ўстановы мабілізаваны для лікпунктаў, адчуваецца недахват памяшканьняў.

Трэба адзначыць, што ня ўсе арганізацыі зварачаюць належную ўвагу на ліквідацыю няпісьменнасьці. Так, у той час, калі ЦСПСБ і ЦП саюзаў зварачаюць належную ўвагу на ліквідацыю няпісьменнасьці, нізавыя праф'ячэйкі ў гэтай рабоце прымаюць удзел вельмі слабы.

Каапэрацыя таксама прымае вельмі слабы ўдзел, не адпускае належных сродкаў, якія паводле пастаноў, павінны былі быць адпушчаны.

ЦБ пралетэтуду Беларусі зусім не займалася пытаньнем аб удзеле студэнцтва ў ліквідацыі няпісьменнасьці. Толькі паасобныя ВНУ на сваёй уласнай ініцыятыве вылучылі кадры для ліквідацыі няпісьменнасьці.

Камсамол, які павінен быў-бы быць ініцыятарам ліквідацыі няпісьменнасьці, яшчэ працуе ў гэтым напрамку мала.

Трэба адзначыць, што і нізавыя партыйныя ячэйкі слаба кіруюць і кантралююць выкананьне дырэктыў ЦК КП(б)Б аб ліквідацыі няпісьменнасьці.

Да сацспаборніцтва паміж асобнымі акругамі і раёнамі на лепшую ліквідацыю няпісьменнасьці толькі зараз пачынаюць прыступаць.

У выніку трэба сказаць, што, ня гледзячы на вялікую работу, якая праведзена па ліквідацыі няпісьменнасьці, ўсё-ж яна зьяўляецца слабой, і да гэтай справы павінна быць прыцягнута ўвага ўсёй грамадзкасьці.

М. А.

Менск выклікаў Віцебшчыну на спаборніцтва

20 сьнежня адбыўся пашыраны пленум Менскага акруговага савету «П. Н.». Пленум вызначыў рад мерапрыемстваў для большага разгортваньня працы па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці і выклікаў на сацспаборніцтва Віцебскую акругу. Дагавор спаборніцтва ўключае наступныя пункты. На працягу 1929-30 н. г. навучыць грамаце 25.000 чал. няпісьменных і 5.000 малапісьменных. Да 1-га мая 1930 году поўнасьцю ліквідаваць няпісьменнасьць сярод індустрыяльных рабочых членаў саюзу, рабочых саўгасаў, батрацтва, членаў камун і калгасаў, якія арганізаваліся ў кастрычніка г. г., дапрызыўнікаў, нерамеснікаў, жанчын - дэлегатак, усяго актыву ва ўзросьце да 35 год і падросткаў ва ўзросьце ад 12 да 15 год.

У 1930-31 навуч годзе поўнасьцю ліквідаваць няпісьменнасьць у раёнах і сельсаветах суцэльнай калектывізацыі, арганізаваўшы пры буйных прадпрыемствах, калгасах. саўгасах пастаянныя лікпункты; забясьпечыўшы іх сродкамі і прыладамі. У 1931-32 навуч. годзе ліквідаваць няпісьменнасьць па ўсёй акрузе сярод працоўнага насельніцтва. Колькасьць членаў «П. Н.» да 1-У 1930 г. давесьці да 25 асоб, і, як мінімум. мець ячэйкі ў кожным сельсавеце, саўгасе, калгасе і жакце. Вось асноўныя моманты сацспаборніцтва.

Е. З.

Спорт

ПЛЕНУМ ВЫКАНКОМУ СПОРТІНТЭРНУ—У МЕНСКУ

Прэзыдыум Выканкому Спортінтэрну пастанавіў склікаць чарговы пленум Выканкому ў Менску. Пленум адбудзецца 10-14 мая.

На пленуме прыме ўдзел 50 прадстаўнікоў ад рабочых спартыўных арганізацый усіх краін (акрамя СССР).

АБСЬЛЕДВАНЬНЕ ФІЗКУЛЬТУРНАЙ РАБОТЫ

ВСФК пачынае абсьледваньне фізкультурнай работы ў раёнах суцэльнай калектывізацыі, у першую чаргу, у Клімавіцкім раёне, Магілеўскай акругі.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ПРАЦАЎНІКОЎ ФІЗКУЛЬТУРЫ

30-га сьнежня адбудзецца ўсебеларуская нарада працаўнікоў фізкультуры, сумесна з прадстаўнікамі прафарганізацый. З дакладам аб задачах фізкультурнага руху, у сувязі з пастановамі ЦК УсеКП(б), выступіць старшыня вышэйшага савету фізкультуры БССР тав. Рыжоў.

Паведамленьні

ПУШКІНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА. У навуковай чытальні адкрыта кніжная выстаўка антырэлігійнай літаратуры.

5 студзеня, а 7 гадз. увечары ў памяшканьні пушкінскай бібліятэкі адбудзецца агульны сход бацькоў дзяцей чытачоў. На сходзе будуць вырашаны пытаньні работы дзіцячага аддзелу ў зьвязку з бібліятэчным паходам. Бібліятэка запрашае ўсіх бацькоў дзяцей-чытачоў зьявіцца на гэты сход. Да сходу будзе наладжана кніжная выстаўка дзіцячай літаратуры.

СЁНЬНЯ

У БДзУ. А 8-й гадз. увеч. адбудуцца агульныя зачыненыя сходы ячэек: пэдфаку—у актавай залі, праўгаеу—у 41-й аўдыторыі.

Клюб навуковых працаўнікоў. А 8-й гадз. увеч. адбудзецца сход фота-аматараў, членаў сэкцыі навук. пнац.

Кастрычніцкі райком МОПР'у к 7-мі гадз. увеч. выклікае ў райком сакратароў наступных ячэек МОПР'у: абутковая ф-ка, АБВШ, 13 аўтаброндывізіён, арцель «Энэргія», арцель «Еднаньне», усе цэхі заводу «Бальшавік», Белсельсаюз, Белкапсаюз, Белсампрамсаюз, банкаўскія установы БСК'а, Белмястандаль, п.-к. «Адраджэньне», ДПУ, групком працасьветы № 1, групком пры 7-й школе, групком працасьветы № 3, мясцком № 1 вак. пасажыр., мясцком № 3 вак. пасаж., ЖАКТ'ы №№ 6 і 7 і школы №№ 1 і 18.

Юнсэкцыя Кастрычніцкага РК Мопру. А 7-й гадзіне ўвеч. адбудзецца пасяджэньне юнсэкцыі. Яўка ўсіх сяброў юнсэкцыі і дэлегатак, прымацаваных да сэкцыі абавязкова.

У БДУ з габінэце рэктара, роўна а 5-й гадз. увеч. адбудзецца пасяджэньне асьпіранцкага бюро БДУ. Апрача членаў і кандыдатаў бюро выклікаюцца тт. Багданскі і Лібман. Запрашаюцца жадаючыя асьпіранты.

Клюб Саўнаркому (былы гістарычны музэй, на рагу вул. Савецкай і Чырвонаармейскай). З 26-га сьнежня г. г., што дзённа з 7-й гадз. увеч. будзе праходзіць чыстка партыйнай ячэйкі аўтатрамвайнага кіраўніцтва.

Бюро партыйнай ячэйкі і праверком просяць рабочых і служачых прыняць актыўны ўдзел у чыстцы, а таксама падаваць матар'ял у праверком.

ЗАЎТРА

Жанаддзел Фрунзаўскага РК КП(б)Б. у памяшканьні клюбу Саўгандальслужачых на 7 гадз. увеч. склікае 3-ю групу раённага дэлегацкага сходу. Дэлегаткі пажарнай каманды, хлебазаводу, камбузу, саюзу будаўнікоў, заводу «Камунар», Дзяржстраху, Дзяржсьпірту, Наркамзему, Камгасу і мэталёўстаноў павінны зьявіцца абавязкова.

У гэты-ж самы час у клюбе працасьветы склікаецца першая група дэлегацкага сходу.

У АПА Фрунзаўскага РК а 7 гадз. увеч. склікаецца пленум райсавету Асаавіяхіму. Сакратары вытворчых ячэек КП(б)Б павінны зьявіцца абавязкова.

У вясковым аддзеле МенАК КП(б)Б а 12 гадз. дня адбудзецца нарада па пытаньні арганізацыі рабочага таварыства садзейнічаньня калектывізацыі. Т.т. Калодка, Клімковіч і Вашкевіч (ЦСПСБ), Пятушкоў і Белян (Фрунзаўскі РК), Ляшкоў і Стрыхін (Кастрычніцкі РК) павінны зьявіцца на нараду.

Пэдгабінэт. А 7-й гадзіне ўвечары адбудзецца сход пэдалёгаў і настаўнікаў г. Менску, якія жадаюць працаваць у пэдалёгічнай асацыяцыі. Даклад на тэму: «Пэдалёгія ў масавай школе» зробіць праф. Сарахцін. Інфармацыю аб арганізацыі пэдалёга-педагагічнага інстытуту зробіць старшыня Галоўпавукі т. Панкевіч. Будуць абмяркоўвацца арганізацыйныя пытаньні. Запрашаюцца пэдалёгі, настаўнікі, школьныя ўрачы, дашкольныя працаўнікі г. Менску.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

ТЭАТР і КІНО

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

ПЯТНІЦА, 27 сьнежня, **Д. Бэргельсон**
для саюзу гарбароў Білеты у саюзе. **ГЛУХІ** Пачатак роўна, а 8 гадз. увеч.
Астача білетаў у рабочай касе і ў касе тэатру.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА
Новы мастацкі фільм вытворчасьці Межрабпом-фільм
ЧЫНЫ І ЛЮДЗІ
(ЧЭХАЎСКІ АЛЬМАНАХ)
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
кіно-хроніка Савкіно № 67
Пачатак сэансу а 7 гадзіне

КІНО Цвятвацыянал
Выключны дакумэнтальны фільм
САЛАЎКІ (Салавецкія лягеры асаблівага прызначэньня)
ў 7-мі частках
Звыш праграмы часопісь „Савкіно“ № 69
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Касе--ад 5 гадз.

КІНО Пралетары
Лепшы фільм савецкай вытворч.
АБЛОМАК ІМПЭРЫІ ў 6 ці эпізодах.
Звыш праграмы: кіно-хроніка Савкіно № 61
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. увеч.
Каса адчынена а 5 з палов. гадз.

1-ы дзіцячы кіно-тэатр Кены Піянэр (Будынак кіно „Пралетары“)
ЦІКАВЫ ФІЛЬМ вытворч. САВКІНО
АДАРВАНЫЯ РУКАВЫ
кіно-навэла ў 6 части.
Каса адчынена штодзённа ад 2 гадз. дня.

КІНО Спартак
Звыш праграмы гастроль артысткі Ленінградзкіх тэатраў
Е. Г. ГЕОРГІЕВАЙ.
На экране выдатны замежны фільм
ПАЛКАЕ ЮНАЦТВА драма ў частях
Пачатак 1-га сэансу в 6 г. 30 м. Каса - а 5 г.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты да 2 гадзіны дня

КІНО **„КУЛЬТУРА“.**
За першыя 4 дні пастаноўкі, фільм праглядзела **12.000** чалавек.
З прычыны вялікага посьпеху ставіцца яшчэ 4 дні
26, 27, 28 і 29 сьнежня
НАШУМЕЎШЫ ФІЛЬМ
ЧЫНЫ І ЛЮДЗІ
(чэхаўскі альманах).
1. Сьмерць чыкоўніка; 2. Ганца на шыі; 3. Хамільён.
Звыш праграмы — кіно-хроніка Савкіно № 67.

ОТКРЫТА ПОДПИСКА на 1930 год на иллюстрированный журнал **РАДИО СЛУШАТЕЛЬ**
с 1 января 1930 года будет выходить 3 раза в месяц (по декадам)
Только в „Радиослушателе“ помещаются подробные программы советских и заграничных радиостанций
Программы разъясняются и иллюстрируются
В журнале печатаются статьи, обзоры, фельетоны, хроника по вопросам радиовещания и радиотехники В отделе „Трибуна читателя“ излагаются пожелания, отклики и указания радиослушателей
„Радиослушатель“ печатается способом глубокой печати, позволяющим художественно воспроизводить фотографии и рисунки.
Подписная цена: на 1 год — 6 руб. 6 м.—3 р. 20 к., 3 м.—1 р. 70 к., 1 м.— 60 к.
Цена номера в отдельной продаже — 20 коп.
„Подписка“ принимается во всех почтовых учреждениях СССР, у письмоносцев и в Издательстве НКПТ (Москва, 9, Тверская, 17)

Згубленыя і ўкрадзеныя
наступныя дакументы лічыць несапраўднымі:
Цл. біл. саюзу швайвікаў Аксельрода Н. С. 350
Партбіл. Яглоўскага Я. С., выд. Мен. АК КП(б)Б. 351
Пасьведч. аб сканчэньні Ягораўскай прап. школы II ступ., выд. у 1920 г. на імя Чарапенікавай В. А. 352.
Мэтрыч. вып. Ялова Н. І., выд. мен. ЗАГС'ам.